КАПУСТА, КАРАНЯПЛОДЫ, ГАРБУЗЫ... 4

ГЕРОІ ЛОЕЎСКАГА ПЛАЦДАРМА 8–9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. СУБОТА № 200 (30080)

БЯСЦЭННАЯ КРЫНІЦА ЖЫЦЦЯ

Дарагія суайчыннікі!

Прымеце шчырыя віншаванні з Днём маці.

Гэта добрае і пяшчотнае свята ўвасабляе веліч духоўнай сілы і святасць мацярынства як бясцэннай крыніцы жыцця і адной з найвышэйшых якасцяў жаноцкасці.

Блізкі і родны для кожнага вобраз маці мы праносім у сэрцы праз усё жыццё. У мацярынскай душы бязмежнай любоўю адгукаюцца самыя звычайныя падзеі нашага зямнога шляху. Сваёй мудрасцю і шчырасцю вы вучыце дзяцей быць самастойнымі, прывіваеце ім маральныя каштоўнасці і арыенціры.

Сардэчна дзякую кожнай з вас за чуласць, цярпенне і клопат аб дабрабыце сям'і і ўтульнасці дамашняга ачага. Словы глыбокай павагі і нізкі паклон шматдзетным і прыёмным мамам, а таксама тым, хто выхоўвае дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Вашы ўвага і спагада ўсяляюць у іх дабрыню, надзею на лепшае і ўпэўненасць ва ўласных сілах.

Жадаю ўсім жанчынам моцнага здароўя і шчасця, а кожнай беларускай сям'і — міру і ўзаемаразумення. Няхай любоў і ўдзячнасць дзяцей стануць для вас найлепшай узнагародай.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Сям'я Кацярыны і Андрэя КАХНО вялікая і дружная. Днём дарослыя і дзеці працуюць, вучацца, ходзяць у дзіцячы садок, а вечарамі заўсёды збіраюцца разам. Вось і ў гэты вечар усе зноў разам — за выключэннем таты Андрэя, які знаходзіцца ў камандзіроўцы.

— Што буду шматдзетнай Мамай, у марах нават не было. Смак мацярынства я адчула пасля нараджэння трэцяга дзіцяці. Я тады зусім дакладна зразумела, што быць Мамай — велізарнае шчасце, і кожнае народжанае дзіця — тая радасць, якую нідзе больш не знойдзеш. Ні праца, ні кар'ера, ні сябры не заменяць гэтай радасці. А падтрымка дзяржавы толькі ўмацоўвае маю ўпэўненасць у тым, што мы, бацькі, займаемся важнай і патрэбнай справай не толькі для нас асабіста, але і для нашай краіны ў цэлым, — кажа Кацярына, узнагароджаная ў маі гэтага года ордэнам Маці.

На гэтым фота — мама Кацярына і яе дзеці: дваццацігадовая Карына, дзесяцігадовая Альбіна, двухгадовая Марыя, шасцігадовы Іван, пятнаццацігадовая Дар'я.

Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Гарантам нашага ўстойлівага і бяспечнага развіцця можам быць толькі мы самі»

Што прапаноўвае Беларусь для эфектыўнага ўзаемадзеяння на прасторы СНД

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочы візіт у Кыргызскую Рэспубліку. Галоўная мэта візіту — удзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. Акрамя таго, традыцыйна на палях самітаў СНД абмяркоўваюцца і пытанні двухбаковага супрацоўніцтва.

Пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД працягвалася амаль пяць гадзін традыцыйна ў шырокім і ў вузкім саставах. Нацыянальныя лідары грунтоўна абмеркавалі ключавыя тэмы супрацоўніцтва на прасторы СНД, а таксама пытанні знешняй палітыкі. Прычым размаўлялі кіраўнікі дзяржаў не толькі ў афіцыйным фармаце, але і ў кулуарах «на нагах». Аляксандр Лукашэнка прадставіў пазіцыю і прапановы Беларусі па найбольш актуальных пытаннях узаемадзеяння ў рамках Садружнасці.

Аб неабходнасці кансалідацыі ў СНД і развязцы канфліктаў

«Пачаць сваё выступленне хацеў бы з асноў. Нагадаю, што галоўнай мэтай стварэння Садружнасці было не дапусціць разрыву сувязяў пасля развалу Савецкага Саюза. Гэта не задавальняла і сёння не задавальняе нашых канкурэнтаў — Захад, які дагэтуль не пакідае спроб расхістаць нас, аслабіць і падпарадкаваць сваім інтарэсам. Спачатку выйшла з нашага аб'яднання Грузія, дэ-факта з намі няма Украіны. Вялікія пытанні па Малдове. Не заўсёды па-партнёрску паводзіць сябе, на жаль, Арменія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у вузкім саставе.

СТАР. 2

КАРОТКА

- У Беларусі каля 85 працэнтаў дзяцей-сірот выхоўваецца ў замяшчальных сем'ях.
- **Беларусь і Кітай маюць намер супрацоўнічаць у будаўніцтве біяфармацэўтычнага парка.**
- Тавараабарот Гомельскай і Бранскай абласцей у 2023 годзе вырас больш як на 17 працэнтаў.

ISSN 1990 — 763X

Матуліна багацце

СЯМЕЙНЫ АНСАМБЛЬ

У свае 34 гады яна мае каханага мужа, сем сыноў і дзвюх дачок. Дзеці радуюць поспехамі ў вучобе, займаюцца музыкай

Іх дом, высокі, прыгожы, на вуліцы Савецкай у Войскай відаць здалёк. На вышыню будынка паўплывала наяўнасць цокальнага паверха. Каб падняцца ў пярэдні пакой, трэба пераадолець чатырнаццаць прыступак. Гэта і ёсць першая задачка па матэматыцы для самых малых — палічыць прыступкі. Зранку вялікі дом напаўняецца галасамі, потым усе разыходзяцца на працу і вучобу, а мама вялікага сямейства Валянціна застаецца з меншым паўтарагадовым Раманам.

ВЯЛІКАЯ СЯМ'Я ЯК ТРАДЫЦЫЯ

Дзень у іх звычайна папярэдне распланаваны, усё робіцца хутка, дакладна. Як жа іначай паспець? А яшчэ тут усе дапамагаюць адно аднаму, усе ведаюць свае абавязкі і прытрымліваюцца іх. Шматдзетныя бацькі Валянціна і Мікалай ЛІТВІНЮКІ таксама выраслі ў вялікіх сем'ях: у жонкі — сем братоў і сясцёр, у мужа — пяць. «І на вялікую сям'ю мы былі настроены адразу, — гаворыць маці сямейства. — Калі Бог дае дзіцятка, — паказвае яна на меншага, што не злазіць з матчыных каленяў, — то хіба яно будзе галоднае? У нас дома гадаваліся чатыры сястры і чатыры браты.

СТАР. 5

«Гарантам нашага ўстойлівага і бяспечнага развіцця можам быць толькі мы самі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён падкрэсліў, што за гэтым нельга спакойна назіраць збоку: «Інакш нас проста парвуць на часткі. І пацерпяць перш за ўсё простыя людзі — народы нашых краін. Таму мы — кіраўнікі дзяржаў — павінны выконваць волю сваіх выбаршчыкаў. І прынамсі выканаць і вырашыць тыя задачы, якія мы абяцалі. І ў прынцыпе сёння час больш крытычна ацаніць сітуацыю ў нашай Садружнасці. Нам не варта хаваць галаву ў пясок. Мы ж бачым, што ўсе застарэлыя канфлікты, якія нам падкінулі ў свой час, непазбежна выходзяць вонкі з вельмі сумнымі наступствамі. Дзякуй богу, што не проста намецілася тэндэнцыя да развязкі гэтых канфліктаў, але некаторыя з іх паспяхова пераадолены», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вырашаць існуючыя задачы неабходна менавіта цяперашняму пакаленню палітыкаў, якія нарадзіліся і былі выхаваны ў Савецкім Саюзе: «Вопыт і веды ў нас ёсць. Цяперашняя моладзь наўрад ці справіцца. Большасць з іх ужо не разумеюць многіх каштоўнасцяў і выгад, якія нас аб'ядноўвалі і пакуль што аб'ядноўваюць цяпер, — растлумачыў ён. — Ажыццявім гэта — і да нас зноў далучацца тыя, хто сёння бачыць вырашэнне сваіх пытанняў недзе там, за акіянам. А там увогуле слаба ўяўляюць, дзе знаходзяцца нашы краіны».

Беларускі лідар падкрэсліў, што настаў час сур'ёзнай кансалідацыі ў рамках Садружнасці і прыкладаў паспяховай работы дастаткова. Гэта ў тым ліку пацвярджаецца насычаным парадкам дня саміту, які ўключае ў тым ліку шэраг найважнейшых сумесных заяў. «Яны пацвярджаюць наяўнасць у краін агульных падыходаў да такіх актуальных пытанняў, як свабода веравызнання, недапушчальнасць дыскрымінацыі па моўнай прыкмеце, гарманізацыя сістэм дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавых тэхналогій», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аб шматпалярнасці і запыце на больш справядлівае светаўладкаванне

Прэзідэнт асабліва адзначыў важнасць выхаду на прыняцце заявы аб міждзяржаўных адносінах у шматпалярным свеце: «Яна ў цэлым адлюстроўвае наша агульнае бачанне асноў светапарадку, за выключэннем абзаца, у якім прапаноўвалася выказаць заклапочанасць наконт палітызацыі дзейнасці міжнародных судоў. Але нават такая мяккая фармулёўка была падтрымана не ўсімі. Навошта нам гэтыя міжнародныя суды? Тым больш у нашых адносінах. Тым больш мы разумеем, асабліва цяпер, для чаго гэта робіцца. Відаць, кагосьці гэта проста пакуль не закранула. Калі-небудзь захочаце і вы дапамагчы дзецям, падарыць ім крыху дзяцінства, выратаваць ад бамбёжак і выбухаў, а вас за гэта аб'явяць у міжнародны вышук», — заўважыў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што ва ўмовах сітуацыі, якая імкліва змяняецца, запыту на больш справядлівае светаўладкаванне як ніколі запатрабаваны аб'яднанні, якія шукаюць шляхі пашырэння і ўмацавання супрацоўніцтва, мірнага суіснавання, прававых гарантый развіцця і ўстарання дыскрымінацыі па прыкмеце веравызнання або ўзроўню даходаў. «Наша Садружнасць якраз і з'яўляецца адным з такіх аб'яднанняў, — упэўнены кіраўнік дзяржавы. — Чаму мы не ўсе яе цэнім? У нас жа назапашаны вялікі вопыт канструктыўнай работы, які цікавы за межамі СНД. Да яго прыглядаюцца іншыя інтэграцыйныя аб'яднанні. А ў многіх яно як бялмо на воку».

©Фота БелТА.

Пра мову, якую нельга страціць

Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні назваў вельмі своечасовай і запатрабаванай ініцыятыву Прэзідэнта Казахстана Касым-Жамарта Такаева аб заснаванні міжнароднай арганізацыі па рускай мове. «Вы ведаеце, мы сёння ўсе размаўляем на рускай мове, таму не так востра адчуваем гэтую каласальную праблему. А паглядзіце ж на моладзь у нашых рэспубліках. Многія размаўляюць на рускай мове горш і слабей, чым на англійскай і іншай. Гэта (валоданне рускай мовай) найвялікшы наш здабытак. Можам дастукацца да таго, што будзем мець зносіны праз перакладчыка. Нельга страціць мову міжнацыянальных зносін, як яе завуць. І потым, я наогул не разумею, а чаму яе павінны страціць? Яна, што, шкодзіць нам, нашаму пакаленню? Не. Яна не павінна шкодзіць і пакаленню нашых дзяцей. Гэта наш здабытак», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што заўсёды гаварыў аб тым, што руская мова — гэта не расійская мова: «Гэта наша агульная мова. Мы былі ў адзінай дзяржаве доўгі час. А зыходзячы з канцэпцыі, што мова жывая, творча развіваецца, дык мы ж разам развівалі гэтую рускую мову. Там часцінка азербайджанцаў, узбекаў, таджыкаў і гэтак далей. Не толькі рускіх і беларусаў».

Аб пашырэнні зоны ўплыву СНД, супрацоўніцтве ў ШАС і БРІКС

Гаворачы аб пашырэнні зоны ўплыву СНД, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Беларусь заўсёды была прыхільнікам спалучэння дзейнасці міжнародных інтэграцыйных аб'яднанняў з сугучнымі мэтамі і задачамі. Базавая ўмова — мы павінны падтрымліваць адна адну, а не ствараць перашкоды. Мяркую, што для дзяржаў — удзельніц Садружнасці могуць быць цікавыя ўжо існуючыя напрацоўкі па лініі іншых нашых фарматаў, напрыклад, па такіх важных тэмах, як электронны гандаль, шырокае ўкараненне лічбавых тэхналогій, доступ да дзяржаўных закупак, зніжэнне тарыфаў тэлефоннай сувязі ў роўмінгу і многіх іншых напрамках», — заявіў ён. Беларускі лідар упэўнены, што супрацоўніцтва ў рамках ШАС і БРІКС, рэалізацыя высокатэхналагічных праектаў, адпрацоўка новых схем лагістыкі пры пастаўках тавараў у краіны далёкай дугі, у тым ліку актыўнае развіццё калідора «Поўнач — Поўдзень», цесная каардынацыя намаганняў для забеспячэння міжнароднай харчовай бяспекі найбольш уразлівых краін свету — усё гэта ўяўляе цікавасць і павінна актыўна развівацца без асцярогі трапіць пад другасныя санкцыі Захаду.

Аляксандр Лукашэнка асабліва звярнуў увагу на новы трэнд, звязаны з развіццём такіх буйных міжнародных арганізацый, як ШАС і БРІКС. «Безумоўна, гэта арганізацыі, магчыма, і будучыні. Але бачыце, што пэўнае тармажэнне там прысутнічае. Усё ж такі ўзровень інтэграцыі паміж (партнёрамі. — **«Зв.»**) ЕАЭС і СНД у нас вышэйшы, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — А калі б мы былі ў ШАС і БРІКС, калі мы б там былі як адзіная арганізацыя, гэта, што, аслабіла б нашы пазіцыі? Не. І я ўпэўнены, што тут і Расіі трэба больш актыўна сябе паводзіць, няглядзячы на тое, як там амерыканцы ці Захад сябе паводзяць або куды яны глядзяць».

Аб сітуацыі ў свеце і на Блізкім Усходзе

«Павінен сказаць, што сітуацыя мяняецца катастрафічна хутка. Вельмі мяняецца. З'яўляюцца ўсё новыя і новыя выклікі. Вазьміце Блізкі Усход. І яны ўжо не толькі нас падтрасаюць. Яны ўжо падтрасаюць увесь свет. Дай бог спыніцца, каб да трэцяй сусветнай вайны не падысці», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь у адказ на эканамічны націск сумесна са сваімі саюзнікамі, перш за ўсё Расіяй, кансалідавала сілы для ўстойлівага эканамічнага развіцця. Захавана макраэканамічная і фінансавая стабільнасць. Забяспечаны выхад на траекторыю росту. «Ды і Расія добра ўскалыхнулася і па многіх напрамках эканамічнага развіцця стала на парадак больш самадастатковай. А калі б мы разам Садружнасцю плячо ў плячо паставілі заслон гэтым страшылкам заходнім, нашы агульныя вынікі былі б значна вышэйшыя, — упэўнены беларускі лідар. — Успомніце, калі мы былі ў Савецкім Саюзе, нас баяліся ўсе. Баяліся і паважалі. На жаль, свет такі, што паважаюць толькі сілу. А цяпер разам з Кітаем, Іранам, Бразіліяй, ды і Глабальным Поўднем, якія заходнія санкцыі? З нашым меркаваннем будуць лічыцца толькі тады, калі мы будзем разам. А нашае меркаванне ў міжнародных справах будзе вызначальным».

Аб каштоўнасці фармату СНД і міжрэгіянальным супрацоўніцтве

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што партнёрамі шмат зроблена на будучыню: «Пакуль на Захадзе інвестуюць у вайну, а, прасцей кажучы, транжыраць грошы сваіх падаткаплацельшчыкаў, мы з кожным годам павялічваем капіталаўкладанні з далёкім прыцэлам — у навукаёмістыя вытворчасці, такія як мікраэлектроніка, авіябудаванне, біятэхналогіі, штучны інтэлект, інфармацыйна-камунікацыйныя рашэнні. Многія праблемы мы можам вырашыць толькі разам. Калі не будзем разам, будзем толькі размаўляць на гэтыя тэмы».

«Гарантам нашага ўстойлівага і бяспечнага развіцця можам быць толькі мы самі. А для гэтага трэба быць самадастатковымі ў стратэгічна важных галінах. Рэсурсы, патэнцыял, кампетэнцыі для гэтага ёсць. Неабходна палітычная воля і разуменне каштоўнасці фармату Садружнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што трэба ў што б там ні стала захаваць унікальныя фарматы адзінства на прасторы СНД, нельга дапусціць унутранага расколу і далучэння да ідэолагаў і праваднікоў санкцыйнага націску. Таксама катэгарычна недапушчальна паддавацца на правакацыі, накіраваныя на распальванне міжнацыянальных і тэрытарыяльных спрэчак на постсавецкай прасторы.

«Вы адчуваеце, што мы і расіяне зразумелі вельмі сур'ёзна, дзе знаходзімся. І асабліва мы, беларусы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым ён звярнуў увагу на тое, што і іншых краін Садружнасці чакаюць няпростыя часы. «З аднаго боку — зразумела: вялікі брат, які імкнецца нам дапамагчы. Натуральна, у яго свае інтарэсы. З іншага боку — амерыканцы, Захад, вы ўжо гэта адчулі. Не забывайце, што наша шчасце тут. Вось за гэтым сталом кіраўнікі дзяржаў, якія могуць ашчаслівіць нашы народы, калі мы вырашым некаторыя пытанні, якія не ўдавалася доўгі час вырашыць», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы з задавальненнем адзначыў падпісанне ў бягучым годзе ў СНД Пагаднення аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый. «Перакананы, што гэта своечасовы, важны дакумент. У рэчышчы гэтых дакументаў, а таксама ў працяг прынятых раней прапаную актывізаваць работу па пашырэнні міжрэгіянальнага эканамічнага супрацоўніцтва. Сёння добрую фразу Шаўката Мірамонавіч (Мірзіёеў, Прэзідэнт Узбекістана. — **«Зв.»**) сказаў: «Калі мы не будзем перашкаджаць рэгіёнам, а яшчэ ў нечым ім дапаможам, яны без нас вырашаць многія праблемы». Гэта наш безумоўны і запатрабаваны патэнцыял. Вопыт ёсць, — сказаў беларускі лідар. — Прапанаваная раней Рэспублікай Узбекістан ініцыятыва аб правядзенні Форуму рэгіёнаў СНД з'яўляецца актуальнай і патрабуе больш хуткай практычнай рэалізацыі. Гэта павінна стаць адной з прыярытэтных задач. Неабходны вопыт і напрацоўкі ў двухбаковым фармаце ў дзяржаў Садружнасці ёсць».

Вынікі саміту

Па выніках пасяджэння прыняты шэраг рашэнняў і падпісаны адпаведныя дакументы. Вырашана, што старшынстваваць у СНД у 2024 годзе будзе Расійская Федэрацыя.

Удзельнікі саміту абмеркавалі і прынялі Дагавор аб заснаванні Міжнароднай арганізацыі па рускай мове. Прыняты таксама чатыры заявы: аб супрацоўніцтве ў сферы лічбавізацыі ў дзяржаўным кіраванні; аб міжнародных адносінах у шматпалярным свеце; аб абароне права чалавека і грамадзяніна на свабоду веравызнання; аб падтрымцы і прасоўванні рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін. Кіраўнікі дзяржаў заснавалі медаль «За ўклад ва ўмацаванне міру». Узнагарода стане адзінай міждзяржаўнай адзнакай, якая адлюстроўвае прызнанне асаблівых асабістых заслуг грамадзян дзяржаў Садружнасці, а таксама прадстаўнікоў іншых дзяржаў ва ўмацаванні міру і падтрыманні міжнароднай бяспекі. Культурнай сталіцай СНД у 2024 годзе аб'яўлены горад Самарканд.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

Дарэчы

Перад пасяджэннем кіраўнікоў дзяржаў Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. Лідары дзвюх краін абмеркавалі далейшую работу па развіцці адносін Беларусі і Узбекістана. Было адзначана, што тавараабарот мае пазітыўную дынаміку, але патэнцыял яго росту значна большы. У гэтым плане галоўнае на сённяшні момант — зрабіць наступны крок. Гэта задача ўрадаў. У эканоміцы важна развіваць паглыбленую кааперацыю. Беларускія тэхналогіі цікавыя для Узбекістана ў розных галінах, перш за ўсё прамысловасці. Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў намецілі план работы і абмеркавалі падрыхтоўку да маючага адбыцца візіту Прэзідэнта Беларусі ва Узбекістан. Прэзідэнты на сустрэчы таксама закранулі пытанні маладзёжнай палітыкі, супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Грунтоўна Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў абмеркавалі і глабальны парадак дня — сітуацыю ў свеце, гарачых пунктах, рэгіянальны зрэз. Цяперашняя сустрэча, як адзначылі лідары дзвюх краін, — гэта задзел на будучыню.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского РайПО (продавец) извещает о проведении **25 октября 2023 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Предыдущая публикация – 28.09.2023 г.

Лот № 1: Кап. строение с инв. № 311/С-51753 площадью 1063,7 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,5738 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова, 11А
Кап. строение с инв. № 311/С-30479, площадью 856,5 кв. м, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым № 321250100002000395 площадью 0,5738 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Плеханова
В лот входит оборудование 17 ед., список на сайте www.deloocenka.by
Начальная цена продажи без НДС – 39 100,00 бел. руб. **Задаток** 250,00 бел. руб.
Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

Продавец: Добрушское РайПО, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел. +375 29 690-00-10. **Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24.10.2023 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола. Стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

О реализации имущества ООО «Логцентр»

Организатор торгов	ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290
Продавец	ООО «Логцентр», УНП 192757823
Форма, дата, время и место проведения торгов	Торги в форме открытого аукциона **15.11.2023 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 911**
Сведения о предмете проведения торгов	
Объект недвижимости (одним лотом): капитальное строение с инвентарным номером 600/С-152974 (наименование – здание склада с АБК, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общая площадь – 5605,3 кв. м, составные части и принадлежности – одно-двухэтажное смешанной конструкции здание склада с АБК, с водоводом для водоснабжения а1), расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 623687500001000002, 623687500001000006 по адресу: 223039, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Хатежинский с/с, 26, район аг. Хатежино (адрес объекта торгов). **Сведения о земельных участках**: - земельный участок с кадастровым номером 623687500001000002, площадь составляет 0,8599 га; - земельный участок с кадастровым номером 623687500001000006, площадь – 0,8359 га. Назначение земельных участков – для обслуживания административного здания, складских помещений, котельной и инженерных коммуникаций. Предоставлены Продавцу на праве постоянного пользования. По вопросу ознакомления с предметом торгов, за дополнительной информацией обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 3750494	
Начальная цена предмета торгов: Лот № 1 – 4 103 680,79 доллара США с НДС по ставке 20 %	
Порядок проведения торгов	
Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %	
Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка	
Задаток в сумме 1 % от стоимости предмета торгов – 41 036,81 доллара США перечисляется по лоту в срок по 14.11.2023 на р/с BY78BPSB30121732950169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату внесения платежа. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: info@likvid.by до 15.00 14.11.2023	
Возмещение затрат	Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и вознаграждение Организатору аукциона по результатам аукциона в размере 0,3 % от окончательной цены продажи Объекта в течение 5 дней со дня проведения аукциона
Документы, необходимые для участия в торгах	Заявка на участие в торгах; платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах

Духоўнасць

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНЫ БРЭНД

У Полацку адбылася «Размова аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава»

Тэматычная размова завяршыла трыяду мерапрыемстваў, арганізаваных Саветам Рэспублікі і Беларускай праваслаўнай царквой да Дня маці. Яе ўдзельнікі, сярод якіх — сенатары, прадстаўнікі духавенства, міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, сем'і з розных рэгіёнаў Беларусі — абмеркавалі, як захаваць славянскія сямейныя каштоўнасці, якім чынам аб'яднаць намаганні дзяржавы, грамадзянскай супольнасці, царквы і кожнай сям'і, каб умацаваць інстытут сям'і і папулярызаваць традыцыйныя каштоўнасці. Па выніках тэматычнай размовы сфарміравана дарожная карта далейшых сумесных дзеянняў па рэалізацыі сямейнай палітыкі ў нашай краіне.

Справядлівасць, адказнасць, клопат

Як звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** у выніку гістарычнага развіцця сфарміраваўся каштоўнасны код грамадства, у аснове якога — дабрабыт краіны, сям'і, душэўны камфорт, імкненне забяспечыць сваім дзецям больш высокія стандарты жыцця. «Прэзідэнт Беларусі абазначыў асноўныя прынцыпы сацыяльнага развіцця нашай дзяржавы, — нагадала яна. — Гэта прынцып справядлівасці ў размеркаванні сацыяльных даброт і роўным доступе для грамадзян нашай краіны. Другі прынцып — адказнасць. Дзяржава бярэ на сябе абавязацельствы перад грамадствам, гарантуе ўсебаковую і маштабную падтрымку на працягу жыцця чалавека. Трэці прынцып — клопат, які выяўляецца ў шырокай сістэме сацыяльнай дапамогі грамадзянам, якія трапілі ў складаныя жыццёвыя абставіны».

Фота БелТА

На словах спікера верхняй палаты парламента, у Канстытуцыі Беларусі вызначаны галоўныя прыкметы традыцыйнай беларускай сям'і, дзе мужчына і жанчына знаходзяцца ў шлюбе, выхоўваюць дзяцей. Дзяржава забяспечвае іх сацыяльныя гарантыі і магчымасці для самарэалізацыі. «Аднак, знаходзячыся ў самым сэрцы Еўропы, Беларусь не можа не адчуваць на сабе ўласцівых многім краінам свету тэндэнцый — больш познія ўступленні ў першы шлюб і нараджэнне першага дзіцяці, нерашучасць у нараджэнні другога, нарастанне дэмаграфічнага дысбалансу, старэнне насельніцтва, міграцыя, — канстатавала Наталля Качанава. — Відавочна, што прычына гэтага — зусім не ва ўмовах жыцця і магчымасцях, якія прадстаўляюцца дзяржавай, а ў змене светапоглядных установак і псіхалогіі людзей».

Умацаванне традыцыйных каштоўнасцяў, статусу сям'і заўсёды былі і застаюцца ў ліку ключавых напрамкаў заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі. «Безумоўна, парламентарыям, выканаўчым органам, мясцовай уладзе, грамадскім арганізацыям, культурнай і рэкламнай індустрыі, сродкам масавай інфармацыі трэба яшчэ шмат зрабіць для захавання і прымнажэння традыцыйнай вялікай і дружнай сям'і, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі. — У беларускім грамадстве павінна трывала замацавацца ўсведамленне і безумоўнае прыняцце таго, што дзеці — гэта велізарная радасць і адно з галоўных дасягненняў у жыцці кожнай сямейнай пары».

Пры гэтым Наталля Качанава лічыць, што вельмі важна, каб дзяржаўная сямейная палітыка была не рэакцыяй на наяўную сітуацыю, а аб'ектыўна ўлічвала бягучыя тэндэнцыі і прагнозы развіцця нашай краіны, еўразійскага рэгіёна і свету, задавала трэнды і, несумненна, працавала на перспектыву. «Крокі павінны быць паслядоўнымі, сістэмнымі і ахопліваць абсалютна ўсе сферы жыццядзейнасці асобы, грамадства і дзяржавы, — заўважыла спікер. — Неабходна ў найбліжэйшы час актуалізаваць дзеючыя нарматыўныя прававыя дакументы ў сферы дзяржаўнай сямейнай палітыкі Рэспублікі Беларусь».

Плануецца, што «Размова аб важным» стане штогадовым мерапрыемствам, з пастаянным пашырэннем геаграфіі і адкрытым этнаканфесійным складам удзельнікаў з усіх рэгіёнаў краіны. «Абгрунтавана прызнаць сямейную палітыку адным з галоўных напрамкаў дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці ў рамках наступнага, 2024 года, які, па прапанове нашага Прэзідэнта, Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, можа прайсці пад назвай Год якасці, — лічыць Наталля Качанава. — Няхай усе саюзы жанчын і мужчын, якія заключаюцца і існуюць у нашай краіне, адносіны ў шлюбе і сям'і будуць са знакам якасці, а традыцыйныя каштоўнасці беларускага народа — нашым нацыянальным брэндам».

Старшыня Савета Рэспублікі лічыць, што, прытрымліваючыся праваслаўных традыцый, нам трэба больш маштабна адзначаць дзень памяці святых дабраверных князя Пятра і княгіні Фяўроніі, мурамскіх цудатворцаў. Яна нагадала, што гэты дзень увасабляе аснову чалавечага жыцця ў адзінстве жаночага і мужчынскага пачаткаў, падкрэслівае двухадзіную сутнасць сям'і, дэманструе значнасць цэласнасці гэтага сацыяльнага інстытута і каштоўнасныя арыенціры беларускай дзяржавы.

Заслон амаральнасці і трансляцыя правільных прыкладаў

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, заўважыў, што з кожным годам прэстыж традыцыйнай хрысціянскай сям'і падае, сутыкаючыся з выклікамі часу, нездаровымі трэндамі на так званыя грамадзянскія, гасцявыя, пробныя шлюбы. Вялікі ўплыў на моладзь, па яго словах, аказваюць плыні, якія навязваюцца з-за мяжы, дзе заахвочваюць аднаполыя адносіны, прапагандуюць сярод школьнікаў перакручаныя ўяўленні аб сям'і і шлюбе. Уладыка звярнуў увагу на тое, колькі негатыву, жорсткасці ліецца на дзяцей, якія глядзяць папулярныя кіна- і мультфільмы і спрабуюць быць падобнымі да зорак Галівуда.

«Забаронамі такія праблемы не вырашыць, мы павінны паставіць заслон амаральнасці і транслюваць правільныя прыклады, — перакананы мітрапаліт. — Гісторыі паўнацэнных і вялікіх сем'яў дапамогуць дзіцяці адрозніць праўду ад хлусні, убачыць прыгажосць там, дзе яна ёсць».

Праблема такога занепаду сямейных каштоўнасцяў, паводле слоў кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы, з'яўляецца збольшага сацыяльнай, калі ідэалы грамадства нівеліруюцца, а часткова тлумачыцца падзеннем асабістай культуры і выхавання. «Многія не разумеюць, які моцны ўплыў аказваюць традыцыйныя каштоўнасці на жыццё сям'і і грамадства ў цэлым, — падкрэсліў ён. — Ёсць маса прыкладаў, калі развітой і матэрыяльна забяспечанай дзяржаве нават пры правядзенні актыўнай дэмаграфічнай палітыкі так і не ўдавалася дасягнуць поспеху ў павелічэнні нараджальнасці. З іншага боку, у дзяржаве, дзе моцныя традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, сем'і, як правіла, шматлікія, нягледзячы на невысокі ўзровень жыцця».

Мітрапаліт Веніямін заўважыў, што за апошнія дзесяцігоддзі многія каштоўнасці, духоўныя прынцыпы былі страчаны, аднак яны не забыты. У іх адраджэнні можна абапірацца на досвед старэйшага пакалення беларусаў, якія памятаюць традыцыі шматдзетных сем'яў. У пагоні за заходнім ладам жыцця мы страцілі спрадвечна сваё, аднак падзеі, якія адбываюцца ў свеце, паказваюць, як важна захаваць сваю аўтэнтычнасць. «Адраджаючы і аднаўляючы тое, што было страчана, мы павінны памятаць, што з'яўляецца асноватворнымі і вышэйшымі функцыямі сям'і, — сказаў ён. — Гэта адносіны, любоў, падтрымка адно аднаго, вернасць, выхаванне дзяцей, дасягненне высокамаральных ідэалаў — усё гэта застаецца».

Уладыка заклікаў да кансалідацыі сіл і кааперацыі ўсіх зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў, СМІ і прапанаваў стварыць адзіны савет, які займаўся б пытаннямі сям'і і шлюбу. Ён перакананы, што разам можна змагацца з негатыўнымі тэндэнцыямі, паказваць у сацыяльнай рэкламе прыклады правільных учынкаў, адносін да сям'і і акцэнтаваць увагу на станоўчых якасцях чалавека.

Паводле БелТА.

АПОШНЯЕ ПРЫВІТАННЕ ЦЕПЛЫНІ

Капуста, караняплоды, гарбуз: колькі каштуюць апошнія «жывыя» вітаміны гэтага лета?

«Увосень прырода палохаецца, пераварочваецца і расце ўніз галавою, нараджаючы напрыканцы грубыя, суровыя, каравыя стварэнні — чорны купал рэдзькі, белы нерв хрэну, патаемныя бульбяныя гарады...» — не зусім дакладная цытата з аднаго сучаснага аўтара. Зрэшты, гэтыя «суровыя стварэнні», часам не надта прывабныя на выгляд, насамрэч тояць у сабе скарбніцу вітамінаў. Многія з іх дыеталогія называе «суперфудамі нашых шырот» — прадуктамі з высокай канцэнтрацыяй карысных для здароўя і імунітэту рэчываў.

Такім чынам, ідзём на рынак па «апошняе прывітанне лета» і высвятляем, пачым восеньскія «суперфуды» ў цяперашнім шчодрым на ўраджай годзе.

КАПУСТА — У МОДЗЕ

— На засолку бераце? Ці на салату? — цікавіцца прадавец. — Для квашання капусты яшчэ рана нават, — дадае ён. — Пакуль на салацік вазьміце, на свежы!

Восень у кулінарыі — гэта, вядома, капуста (наша, класічная, белакачанная), і калі зімой яна ў першую чаргу квашаная, то кастрычнік — самы час для сезонных свежых салатаў з яе. Каштуе сёлета капуста ў сярэднім рубель за кілаграм, а на сезонных рынках па выхадных можна знайсці і па 70–80 капеек. То-бок выдаткаў практычна ніякіх, а карысці — вагон. Па-першае, у ёй велізарная колькасць вітаміну С, які да таго ж захоўваецца ў капусце практычна ўсю зіму. Акрамя таго, багатая капуста і на вітамін U (метылметыянін), які дабратворна ўплывае на работу страўнікава-кішачнага тракта, лечыць язву страўніка і дванаццаціперснай кішкі, гастрыты і каліты і паляпшае функцыянаванне печані. Вітамін А, які капуста змяшчае ў вялікай колькасці, аднаўляе зрок і здольны (пры рэгулярным уключэнні гэтай гародніны ў рацыён) адтэрмінаваць любыя праблемы з вачамі — ад катаракты да блізарукасці. Пры гэтым нязначнае ўтрыманне крухмалу і цукрозы дазваляе ўключаць белакачанную капусту нават у рацыён дыябетыкаў.

Акрамя таго, капуста выдатна насычае пры мінімальным утрыманні калорый, так што яна — фаварыт мадэляў. Сучасная дыеталогія сцвярджае да таго ж, што белакачанная капуста (як і іншыя крыжакветныя — цвятная, брокалі і г. д.) змяшчае рэчывы, якія спрыяюць выпрацоўцы калагену, а значыць, абараняе ад старэння, паляпшае колер твару і эластычнасць скуры. А таксама змагаецца са свабоднымі радыкаламі і паляпшае здароўе валасоў.

Усе гэтыя ўласцівасці ў поўнай меры можна аднесці і да менш танных відаў капусты — цвятной, брокалі, брусельскай і «іншапланетнага» выгляду раманескі, якая таксама ў апошнія гады вельмі папулярная ў аматараў здаровага ладу жыцця. Цвятную капусту прадаюць сёлета па 3.50—4.50 за кіло, брокалі — даражэй: 5.90—6.50 рублёў за кілаграм.

— Вырошчваю брокалі рассадным спосабам, расаду сею ў тыя ж тэрміны, што і раннюю капусту — бліжэй да канца сакавіка, а другі раз — у пачатку чэрвеня, гэта ўжо для восеньскага ўраджаю, — распавядае прадавец Марыя. — Для такой капусты ідэальныя суглінкавыя глебы, якраз як у нас пад Клецкам. Раз на тры гады раблю вапнаванне глебы пад яе і атрымліваю неблагія ўраджаі.

Марыя Ільінічна тлумачыць, што захапілася вырошчваннем брокалі, калі ў яе пачаліся праблемы з сэрцам і артэрыяльным ціскам. Цяпер, кажа, усё нармалізавалася, і яна адчувае сябе здаровай — «ну, наколькі ў наш час можа быць здаровым пенсіянер». Вядома, прымаць прэпараты ад ціску даводзіцца, але правільнае харчаванне таксама вельмі важнае.

— Брокалі і цвятная капуста дапамагаюць пры сардэчна-саудзістых хваробах, паляпшаюць

крывятварэнне, нармалізуюць работу шчытападобнай залозы і выводзяць цяжкія металы, — пералічвае суразмоўніца. — І нават з'яўляюцца прафілактыкай раку, як пішуць урачы.

Капусту сваю вырошчвае яна «без усякай хіміі» — кажа, у тым ліку каб з чыстым сумленнем прадаваць людзям на фермерскіх радах. У гэтым годзе аддае кілаграм за 5.50-6 рублёў, але можа і скінуць цану, асабліва бліжэй да канца дня.

Капуста ў мяне ў рацыёне — прадукт нумар адзін. Усякая: і брокалі, і цвятная, а часцей за ўсё — самая звычайная, белакачанная, — кажа пакупніца Ксенія. — Капуста цяпер у модзе: на ёй усе скідваюць вагу. Плюс гэта танная ежа. Па асабістым досведзе скажу: можна не траціць шмат грошай і пры гэтым харчавацца правільна, важна толькі вывучыць пытанне і збалансаваць рацыён.

Падзялілася суразмоўніца з чытачамі «Звязды» і рэцэптам хуткага і эканомнага ***капуснага пірага*** *(«Праўда, не зусім у межах правільнага харчавання — там патрэбна сталовая лыжка маянэзу», — папярэдзіла дзяўчына).*

— Шэсць сталовых лыжак мукі (лепш — першага або другога, а не вышэйшага сорту, 400 грамаў свежай капусты, пучок кропу, 3 яйкі, сталовая лыжка маянэзу, 5 ст. л смятаны, 3 зубчыкі часнаку, трохі солі і разрыхляльніку для цеста. Можна дадаць кунжут. Капусту дробна наразаю, салю і размінаю рукамі. Здрабняю кроп і змешваю з капустай. Яйкі ўзбіваю з маянэзам, смятанай і нацёртым на дробную тарку часнаком, дадаю муку і разрыхляльнік. Замешваю цеста. Выкладваю капусту з зелянінай у форму, заліваю яечнай сумессю, пасыпаю кунжутам і стаўлю ў разагрэтую да 180° духоўку на 25 хвілін.

ЗОЛАТА ВОСЕНІ

Калі самая розная капуста цяпер — модная ежа, то гарбуз гаспадыні па-ранейшаму чамусьці не надта шануюць, сцвярджаюць прадаўцы.

— Няма звычкі гатаваць з гарбуза, — наракае Алена, да якой мы па старой памяці зазірнулі на фермерскія рады Камароўкі, каб пагаварыць аб яе ўраджаі.

З Аленай мы пазнаёміліся мінулай восенню, яна прывозіць прадаваць у Мінск свае гарбузы. Кажа, любіць гэтую «сонечную», яркую гародніну, вырошчвае і дэкаратыўныя гарбузы (іх раскупляюць лепш, хоць каштуюць яны даражэй — ад 3 да 5 рублёў за штучку), і ядомыя. Свае «экалагічна чыстыя гарбузы» прадае гэтай восенню па 1.50 за кілаграм (на сезонных кірмашах можна было ў мінулыя выхадныя адшукаць і па 1.20). У мінулым годзе, успамінае суразмоўніца, цана на гарбуз была ў сярэднім 3 рублі за кіло. У гэтым гародніна таннейшая, таму што ўраджай добры і няма сэнсу «даражыцца».

Сама Алена гарбуз есць усю зіму, кажа, менавіта гэтая гародніна дорыць ёй здароўе. І, мабыць, у гэтым яна мае рацыю, бо ў складзе гарбуза вітаміны С, РР, Е, А, групы В, а таксама F, D і рэдкі вітамін Т, які ўдзельнічае ў акісленні свабодных тлустых кіслот і змяншае ўзровень тлушчаў у крыві. Таму гарбуз уключаюць у лячэбную дыету пры атэрасклерозе, праблемах з сэрцам і сасудамі. Акрамя таго, ён багаты жалезам, меддзю, селенам, кобальтам, каліем і магніем, а таксама кальцыем, ёдам, цынкам. Змяшчае клятчатку і важныя для здароўя амінакіслоты. Наладжвае работу жоўцевага пузыра, страўніка і кішэчніка, спрыяе зніжэнню аб'ёмаў тлушчавай тканкі ў арганізме — на гарбузах можна гэтак жа эфектыўна худзець, як і на капусце. Але калі крыжакветныя айчынныя аматары здаровага ладу жыцця ўжо дакладна асвоілі і палюбілі, то ўкараніць гарбуз у рацыён нашых сучаснікаў у спецыялістаў правільнага харчавання пакуль не занадта атрымліваецца. Між тым з гарбуза можна гатаваць што заўгодна, гаворыць Алена. Нават **дранікі**. *Яе фірмовы рэцэпт — бульба напалову з гарбузом плюс зеляніна, соль, спецыі і трохі мукі. Мякаць гарбуза націраюць на дробнай тарцы гэтак жа, як і бульбу. Далей гатуйце дранікі з гэтай сумесі, як прывыклі і як падабаецца, — можна з яйкам і мукой, можна без мукі або з мукой але без яйка, па жаданні. У любым выпадку атрымаецца смачна і не так каларыйна, як з адной толькі бульбы.*

ЧАС ПІЦЬ БУРАЧНЫ СОК

Караняплоды — яшчэ адна прыкмета восені, і гэта не толькі карані сельдэрэю і пятрушкі, папулярныя ў прыхільнікаў правільнага харчавання ўжо не першую восень. Дарэчы, каштуе корань сельдэрэю ў гэтым годзе тры рублі за штучку, корань пятрушкі — ад 8 да 12 рублёў за кілаграм. Але нямногія купляюць яго кілаграмамі, а штучка зацягвае недзе на рубель 20 капеек.

Але пагаворым аб бураках і моркве, традыцыйных нашых караняплодах. У гэтым сезоне ў параўнанні з іншымі прысядзібнымі дарамі яны дастаткова дарагія — так, за кіло морквы просяць ад 1.50 на сезонных рынках да 2-2.50 руб. на Камароўцы, пры тым, што кілаграм памідораў яшчэ можна знайсці па 2-2.80, хоць сярэдні кошт ужо 4-4.50.

— Затое морквачка проста цукровая, — расхвальвае свой тавар прадавец. — Салодкая, сакавітая!

Дыетолагі сцвярджаюць, што рэгулярнае ўключэнне ў меню свежай морквы змяншае на траціну рызыку развіцця сардэчных прыступаў. Даследаванні пацвердзілі зніжэнне больш чым на 10 % узроўню халестэрыну ў крыві пры спажыванні 200 г свежай морквы штодня на працягу трох тыдняў. І на 40 % морква скарачае верагоднасць злаякасных новаўтварэнняў у лёгкіх дзякуючы высокаму ўтрыманню бэта-караціну, якога чалавек павінен атрымліваць не менш за 1,7 мг у дзень (гэта асабліва важна тым, хто пакуль не адмовіўся ад шкоднай звычкі курыць). Спажываць моркву лепш з тлушчамі (караціноіды — тлушчараствараль-ныя): у ідэале гэта сырая салата з карысным алеем — рапсавым, напрыклад. Увосень морква больш за ўсё насычаная вітамінамі, так што якраз цяпер — час для такіх салатаў.

— Найлепшыя вітаміны для падтрымання маладосці — у салаце з часнаку і морквы! — сцвярджае Марына. Яна прадае на рынку ў Заслаўі гародніну з уласных градак. Гаворыць, раней вазіла ў Мінск, але і тут гандаль ідзе нядрэнна:

— Агуркі-памідоры ёсць ва ўсіх у агародзе, а пад моркву не ўсе адводзяць градкі. А без морквы ні суп зварыць, ні закаткі паставіць...

Ну і, зразумела, морква падтрымлівае вастрыню зроку, гэта агульнавядома. А таксама дабратворна ўплывае на печань, сэрца, страўнікава-кішачны тракт. І, дарэчы, здымае сіндром хранічнай стомленасці, што ўвосень асабліва актуальна. Заўважым, што на рынках не праблема знайсці сарты і гібрыды морквы ад айчынных селекцыянераў: «Лявоніха», «Мінчанка», «Ліцвінка», нават новы гібрыд «Вулкан».

— Асаблівых складанасцяў пры вырошчванні морквы няма, хоць клімат, вядома, становіцца гарачэйшым, — усміхаецца суразмоўніца. — Новыя сарты нашай беларускай селекцыі цеплаўстойлівыя і засухаўстойлівыя, і іх ураджай не надта залежыць ад надвор'я.

А вось што да буракоў, прапанова па іх, як ні дзіўна, гэтай багатай восенню на рынках не надта вялікая. Прыватнікі гавораць, што для буракоў гэтае лета было ўсё ж гарачым. Каштуюць яны 2-2.50 за кіло. Бурак — галоўная гародніна гіпертонікаў і ўлюбёнец кардыёлагаў. Караняплод эфектыўна чысціць кішэчнік ад шлакаў, а сасуды — ад халестэрынавых бляшак, знiжаючы рызыку развіцця атэрасклерозу, інфаркту, інсульту. Рэгулюе працэс крыватварэння і нармалізуе абмен рэчываў, валодае мачагоннымі ўласцівасцямі, паніжае артэрыяльны ціск, узмацняе перыстальтыку кішэчніка і павялічвае дастаўку кіслароду і пажыўных рэчываў да органаў, тым самым павялічваючы працаздольнасць. Бурак багаты клятчаткай, фоліевай кіслатой, марганцам, жалезам, каліем і вітамінамі (С і B_6). Сярод прычын стаць больш прыхільным да гэтага караняплоду нават у маладым узросце — умацаванне імунітэту, хуткае і бяспечнае пазбаўленне ад лішніх кілаграмаў, а яшчэ бурак карысны будучым мамам: даказана, што ўключэнне гэтай гародніны ў рацыён — прафілактыка ўскладненняў цячэння цяжарнасці.

Так што папулярная ў пенсіянераў звычка піць свежавыціснуты бурачны сок цалкам можа быць актуальная і для тых, каму да пенсіі яшчэ далёка. Праўда, з сокам гэтым усё не так проста, як з іншымі агароднінными сокамі і фрэшамі. Па-першае, у яго дастаткова супрацьпаказанняў, а па-другое, важна памятаць аб мерах засцярогі. Свежавыціснутаму бурачнаму соку трэба даць выстаяцца пару гадзін у адкрытай тары ў халадзільніку, пасля чаго сок трэба працадзіць — інакш замест аздараўлення можна атрымаць рэзкае зніжэнне ціску і дыярэю. А пачынаць піць бурачны сок лепш з чайнай лыжкі ў дзень, паступова даводзячы дозу да паловы шклянкі ў суткі. Медыкі раяць праз два тыдні штодзённага спажывання бурачнага соку зрабіць перапынак.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

БТА БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
30 сентября 2023 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	30.09.2023	01.01.2023
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	22 036	7 999
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	27 771	30 990
5	Средства в банках	1104	54 417	50 531
6	Ценные бумаги	1105	90 451	75 308
7	Кредиты клиентам	1106	224 316	210 081
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	14 732	13 613
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	3 281	3 578
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	3 255	4 150
15	ИТОГО активы	11	440 259	396 250
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	72 424	62 933
19	Средства клиентов	1203	305 151	276 179
20	Ценные бумаги банка	1204	2 762	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	2 127	2 192
24	ВСЕГО обязательства	120	382 464	341 304
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	24 747	24 747
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	1 644	1 524
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	9 613	9 618
30	Накопленная прибыль	1215	21 791	19 057
31	ВСЕГО собственный капитал	121	57 795	54 946
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	440 259	396 250

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
30 сентября 2023 г.

Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	30.09.2023	30.09.2022
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	23 708	24 532
2	Процентные расходы	2012	9 838	17 463
3	Чистые процентные доходы	201	13 870	7 069
4	Комиссионные доходы	2021	4 947	4 719
5	Комиссионные расходы	2022	1 014	1 160
6	Чистые комиссионные доходы	202	3 933	3 559
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	471	(8)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	5 690	6 438
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	53
11	Чистые отчисления в резервы	207	10 550	5 686
12	Прочие доходы	208	3 870	1 660
13	Операционные расходы	209	13 747	11 077
14	Прочие расходы	210	385	437
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	3 152	1 571
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	303	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	2 849	1 571

Председатель Правления Доронкевич А.В.

Заместитель главного бухгалтера Сенько С.Е.

Дата подписания: 9 октября 2023 г.

УНП 807000071

СЯМЕЙНЫ АНСАМБЛЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мы бачылі, як бацькі любяць нас, як клапоцяцца. Памятаю, як мама выходзіла раней з дэкрэтнага, каб мець магчымасць нас лепей апрануць. А бацька пры першай нагодзе ездзіў на заробкі ў замежжа. Мы ніколі не адчувалі сябе абдзеленымі, змалку былі прывучаныя да працы. І ўсе выраслі, усе сталі годнымі людзьмі».

У Мікалая, паводле яго слоў, усе з шасці дзяцей сям'і бацькоў маюць ужо свае сем'і і свае дамы. Мікалай Літвінюк родам з Валынскай вобласці Украіны. Пазнаёміўся з Валянцінай, калі быў у гасцях. А пасля вяселля пераехаў да жонкі на Камянеччыну. Тут, у Войскай, і пачалі віць сваё сямейнае гняздо. Яна ж выйшла замуж студэнткай другога курса Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля нараджэння першага дзіцяці хацела перавесціся на завочнае аддзяленне, але ёй адмовілі, бо месца не знайшлося. А калі чакала другое, ёй ужо прапанавалі завочнае навучанне, а яна сама адмовілася, бо прызвычаілася так вучыцца, каб усё паспяваць. Адным словам, скончыла вучобу паспяхова, на дзень атрымання дыплома была ўжо маці дваіх дзяцей.

НА ЗАНЯТКІ ПА МУЗЫЦЫ

— Можа, таму, што і сама выраслa ў вялікай сям'і, мне не падаецца, што ў мяне дзяцей многа, я не заўважаю гэтага, — разважае Валянціна. — Не разумею, калі пачынаюць спачуваць, маўляў, вы ж, мусіць, свету белага не бачыце з такой сям'ёй. Ды не, я не адчуваю сябе замучанай, знясіленай цяжкай хатняй работай. Наадварот, лічу, што жыву паўнавартасным жыццём. Дзеці — галоўнае для нас, дзеці — тое, дзеля чаго мы жывём. У сям'і так устаявалася, што мы адчуваем прысутнасць адно аднаго, патрэбу адно ў адным.

Усе дзеці Літвінюкоў добра вучацца, усе, акрамя самых малых, займаюцца музыкай. А зараз самы час пазнаёміцца з кожным. Старэйшаму Расціславу 14 гадоў, ён вучыцца ў 9 класе і ўжо скончыў музычную школу па класе фартэпіяна. Андрэй на год маладзейшы, вучыцца ў 8 класе, таксама іграе на фартэпіяна. Трэцяя Іна, ёй 11 гадоў, дзяўчынка займаецца ў музычнай школе па класе скрыпкі. Пяцікласніку Міраславу 10 гадоў, ён іграе на саксафоне, нядаўна, дарэчы, заняў другое месца на абласным конкурсе. Аляксандру 8 гадоў, ён вучыцца ў трэцім класе, а ў музычнай школе асвойвае акардэон. Першакласнік Назар абраў сабе для музычнай адукацыі флейту. Дана наведвае дзіцячы садок, ёй пяць гадоў, яна прыгожа спявае. Рувіму тры гады, ён таксама ходзіць у садок, і самаму меншаму Раману паўтара года.

У госці да вялікай сям'і мы завіталі са старшынёй Войскага сельскага Савета Віктарам Міхайлоўскім і старшынёй Камянецкага раённага Савета Ірынай

Нігерыш. І для нас дзеці з задавальненнем выканалі некаторыя музычныя творы. Расціслаў сыграў на фартэпіяна Калядную песню, Іна сыграла на скрыпцы, Міраслаў — на саксафоне. А Даначка так прыгожа заспявала, што мы заслухаліся. Адным словам, сямейны ансамбль.

ПРА ВУЧОБУ І ДЫСЦЫПЛІНУ

— Якія б ні былі адказныя дзеці, трэба ўвесь час кантраляваць іх вучобу, — гаворыць Валянціна Літвінюк. — Усе мае дзеці вучацца добра, ёсць і выдатнікі. Нядаўна Андрэй стаў найлепшым на раёнай алімпіядзе па матэматыцы і хіміі. Але ж калі толькі на дзень-два аслабіш кантроль, могуць з'явіцца і пяцёркі ў дзённіку. Таму даўно ўзята за правіла ўвечары правяраць выкананне дамашняга задання. Старэйшыя, дарэчы, у нас дапамагаюць малодшым. Але ўсё роўна трымаю працэс пад сваім кантролем.

З расповеду бацькоў вынікае, што дысцыпліна, парадак у такой вялікай сям'і —перадумова ўсяму. Малыя вучацца ў старэйшых, і дапамога, узаемапавага становяцца сямейнай традыцыяй. Усе без выключэння дапамагаюць маці па доме. Зранку, калі дзятва збіраецца ў школу, садок, няма ніякага вэрхалу, бо кашулі і сукенкі падрыхтаваныя з вечара, вісяць у шафе. Усе апранаюцца, засцілаюць ложкі, потым п'юць чай з бутэрбродамі і выходзяць у школу, малых заводзяць у садок.

— У нас кожны ведае, што рэч, якая запэцкалася, адносіцца ў спецыяльны кош, а не вешаецца ў шафу, — працягвае маці сямейства. — Нават самыя малыя пасля абеду ці вячэры абавязкова адносяць са сабой талерку на месца. А большыя дапамогуць не толькі прапласавасіць у пакоях, але і прыбраць у кухні. Такім чынам, прывіваецца чысціня як звычка. Вось зусім нядаўна мяне Ромка маленькі пацешыў. Бачыла, з'еў цукерку, а абгортку нідзе няма. Пытаю ў яго. Ён бярэ за руку, вядзе ў кухню, адкрывае шафку са сметніцай і дастае менавіта свой фанцік.

Бацька ж сямейства гаворыць: «Чым меней у дзяцей вольнага часу, тым лепш. Таму заняткі ў музычнай школе не толькі служаць усебаковаму развіццю дзяцей, але і спрыяюць іх занятасці». Шэсць разоў на тыдзень Валянціна возіць дзяцей у Камянец у музычную школу, гэта 14 кіламетраў. Бывае, што некалькі разоў на дзень даводзіцца ехаць у горад — з горада, каб падстроіцца пад расклад заняткаў. Але ж спраўляецца, прызвычаілася.

ПРА ЧЫТАННЕ І СМАРТФОНЫ

Яшчэ ў гэтай сям'і дзеці шмат чытаюць. У свой час набылі энцыклапедыю «Я пазнаю свет» і кожны том ужо па два разы адолелі. Цікавасці да чытання, паводле меркавання бацькоў, можа паспрыяць адсутнасць мабільных тэлефонаў у штодзённым ужытку. У іх сям'і школьнікі не карыстаюцца смартфонамі. У інтэрнэт заходзяць толькі тады, калі гэта патрэбна для вучобы.

— Мы тлумачым дзецям прычыны такога абмежавання, расказваем, што яны могуць сабе нашкодзіць бескантрольным ужываннем інфармацыі, — кажа Валянціна. — Яны нават папрасілі дазволу часам схадзіць у школу з тэлефонамі, каб аднакласнікі ўбачылі, што ў іх таксама ёсць гэты набытак сучаснасці. І мы дазволілі, вядома. Наогул, мы вельмі многа размаўляем з дзецьмі, тлумачым, расказваем. Пасля вячэры, за якой звычайна збіраюцца ўсе, мы пераходзім у вялікі пакой, чытаем Святое Пісанне, бо мы рэлігійная сям'я, а потым падводзім вынікі дня. Кожны расказвае, як прайшоў дзень, гаворым аб усім, што хвалюе. Калі нехта правініўся, нярэдка ідзе з бацькам у асобны пакой. Гэта называецца «На гутарку». Там падрабязна разбіраецца ўчынак, і расстаўляюцца ўсе кропкі над «і». А яшчэ часта самі дзеці ініцыіруюць такія асобныя размовы з татам альбо мамай.

ПРА АЎТАРЫТЭТ І АДЗІНСТВА БАЦЬКОЎ

— Мяне вельмі радуе, што дзеці раяцца з намі, — працягвае маці сямейства. — Чым яны старэйшыя, тым больш усвядомленыя пытанні задаюць. Нярэдка чуем: «Як ты, тата, альбо ты, мама, зрабілі б у тым ці іншым выпадку?» Самы старэйшы Росцік у дзявятым класе, нядаўна ён завёў гаворку аб будучым паступленні, і першае, што спытаў, — нашай парады.

А яшчэ адметнай рысай сваёй сям'і Валянціна назвала аднадумства бацькоў. Калі ў іх з мужам здараюцца нейкія рознагаласці, то іх высвятляюць паміж сабой асобна, дзецям аб'яўляецца агульны пункт гледжання. «Толькі так, а не інакш, — лічыць галава сям'і. — А то, бывае, прыязджаю вечарам з работы, нехта падбягае з пытаннем, ці можна яму тое або іншае. Я пытаю, што мама сказала на гэты конт. Высвятляецца, што мама сказала: «Нельга». Значыць, нельга, адказваю. Нават калі я дазволіў бы ў выпадку, калі б дзеці адразу звярнуліся да мяне, тут ужо няма выбару. Аўтарытэт бацькоў падтрымліваецца іх адзінствам».

І Валянціна ва ўсім падтрымлівае мужа, сваю надзейную апору. Мікалай займаецца будаўніцтвам, ён індывідуальны прадпрымальнік. Дом уласны пабудаваў, можна сказаць, сваімі рукамі. Спачатку купілі фундамент з цокальным паверхам, потым узялі крэдыт на будаўніцтва, які цяпер ім як шматдзетнай сям'і пагашае дзяржава. Дом атрымаўся прасторны, утульны. Падтрыманне апошняга — ужо клопат жонкі. Валянціна кажа, што выстраіла свой дзень так, каб паспяваць усё. Да абеду стараецца прыбраць, памыць бялізну, прыгатаваць абед, дзе абавязкова ёсць першая і другая стравы, салата. У сям'і любяць таксама выпечку, яна звычайна гатуецца на вячэру. А Іначка стала першай памочніцай мамы ў справе гатавання, і многае ў яе ўжо добра атрымліваецца.

ПРА РАБОТУ І АДПАЧЫНАК

Апошнім часам яны рэгулярна ездзяць сям'ёй у басейн у райцэнтр. Нядаўна даведаліся, што наведванне басейна для шматдзетных сем'яў бясплатнае. Кажуць, што басейн у іх не столькі для спорту, колькі для здароўя. Дзеці любяць заняткі ў вадзе. Часта ўсе разам ездзяць на веласіпедах, практыкуюць вячэрнія прагулкі. «Выйдзем увечары на вуліцу разам, уздоўж стадыёна пройдземся. Гэта ўжо я ініцыятарам выступаю, нават калі нешта не дарабілі, пакідаем на потым і спяшаемся на прагулку», — кажа маці сямейства.

Ёсць у гэтай сям'і невялікі агарод, падсобная гаспадарка ў выглядзе чародкі курэй. І тут дзеці дапамагаюць бацькам ва ўсім. Старэйшыя хлопчыкі ганаравацца тым, што летам тата часам браў іх на аб'екты. Там яны выконвалі пасільную работу — у асноўным прыбіралі будаўнічую пляцоўку і нават зарабілі пэўную суму на кішэнныя расходы.

Праз паўтара года, калі падрасце Ромка, Валянціна плануе выйсці на работу. «Я ў гэтай школе нават працаўладкаваная, але фактычна не працавала. Цяпер, калі дзеці падрастаюць, ужо хочацца на працу, адчуваю патрэбу прымяніць свае веды, атрымана ва ўніверсітэце, наогул выйсці на работу ў калектыў. Думаю, што ўсё паспею, — кажа Валянціна Васільеўна, — пры падтрымцы любімай сям'і, маіх бацькоў».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва сям'і ЛІТВІНЮКОЎ.

Швабский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 15 ноября 2023 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	**д. Молоди, пер. Лесной, д. 25, 623287605101000392** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1051	Черта населенного пункта Имеются сети: Электрификации Подъездные пути водоснабжение	3000,00	600,00	2710,15 + расходы за размещение объявления
2	**д. Чеботари, ул. Хитрая, д. 8, 623287610101000061** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2500	Черта населенного пункта Имеются сети: Электрификации Подъездные пути водоснабжение	3500,00	700,00	2927,56 + расходы за размещение объявления
3	**д. Вербье, 10А, 623287600601000021** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1680	Черта населенного пункта Имеются сети: Электрификации Подъездные пути	3000,00	600,00	2667,34 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона 15 ноября 2023 в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: **8 (01774) 59 1 35, 59 2 35; (+37529) 1071617.**

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 09.11.2023 включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1) подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;

2) предоставить квитанцию об уплате суммы задатка;

3) представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежит возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:

1) д. Чеботари, ул. Хитрая, д. 8 составляет ориентировочно 9818,20 бел. руб. (водоснабжение – 218,20, электроснабжение – 9600,00 бел. руб.);

2) д. Молоди, пер. Лесной, д. 25 составляет ориентировочно – 11574,20 бел. руб. (электроснабжение – 9600,00 руб., водоснабжение – 218,20 руб., транспортная инфраструктура – 1953 руб.);

3) д. Вербье, д. 10А составляет ориентировочно 9600,00 бел. руб. (электроснабжение – 9600,00 руб.)

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Капитальное строение с инвентарным номером 721/С-2967, расположенное по адресу: Могилевская область, Дрибинский р-н, аг. Рясно, ул. Оршанская, 88, общей площадью 121,7 кв. м, год постройки – 1994**
Начальная цена продажи	21 662,06 (Двадцать одна тысяча шестьсот шестьдесят два белорусских рубля 06 копеек), в т. ч. НДС 20 % – 3610,34 (Три тысячи шестьсот десять белорусских рублей 34 копейки). Обязательным условием продажи является приобретение металлической конструкции, приобретенной к зданию по цене 1794,83 (Одна тысяча семьсот девяносто четыре белорусских рубля 84 копейки)
Сумма задатка	1083,10 (Одна тысяча восемьдесят три белорусских рубля 10 копеек) – 5 %
Открытый аукцион состоится	**22.11.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 21.11.2023 включительно по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 71А-2, 5 этаж, кабинет 502
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 752155, моб. 8029-169-39-68

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 1083,10 белорусского рубля на счет № BY69AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 22 ноября 2023 г. с 10.30 до 10.55. В случае не регистрации в выше назначенное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на оценку здания, подготовку и проведение аукциона.

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

опубликованную в газете «Звязда» от 17.12.2021 года, с изменениями и дополнениями, опубликованными в газете «Звязда» от 18.02.2022 г., 26.05.2022 г., 09.07.2022 г., 30.07.2022 г., 24.08.2022 г., 08.09.2022 г., 10.11.2022 г., 03.12.2022 г., 30.12.2022 г., 07.04.2023 г., 20.05.2023 г., 11.07.2023 г., 27.09.2023 г., 28.09.2023 г.

по объекту «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин»

Внести следующие изменения и дополнения в текст проектной декларации:

1. Раздел «Сведения о количестве объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:» дополнить абзацем следующего содержания:

«- 1 (одна) однокомнатная квартира по проекту № 74, расположенная на четвертом этаже в жилой секции 1/2 (по проекту), общей площадью по проекту 144,17 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1507,00 долларам США по официально установленному Национальным банком Республики Беларусь курсу доллара США к белорусскому рублю на дату поступления денежных средств на счет Застройщика».

УНП 191061436

ИНФОРМАЦИЯ о проведении открытого аукциона 16 ноября 2023 г.

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

Организатор аукциона:
Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125.

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь (га)	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка (бел. руб)
1	Смолевичи, ул. Михайловская, 14	624850100 008000868	0,1835	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	40 000
2	г. Смолевичи, ул. Михайловская, 6	624850100 008000871	0,1353	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	32 000

Аукцион состоится 16 ноября 2023 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600014139

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «Третья Планета», г. Минск, ул. Тимирязева, дом-121/3, помещение-2, кабинет-4

Предмет электронных торгов:

торговое помещение, инв. № 500/D-70784916, общ. пл. 244,1 кв. м,

по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, 121/3-2.**
Начальная цена с НДС 20 % – 180 000 долл. США*

Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048 350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Срок оплаты предмета электронных торгов: 30 (тридцать) календарных дней после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2023 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.11.2023 г. с 11.00 до 13.00
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.11.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44)-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-7563 (наименование: столовая; назначение: помещение общественного питания), площадью 129,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Хмелевский с/с, аг. Хмелево, ул. Центральная, 41-4

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	5 222,90	**Размер задатка, руб.**	522,29

Продавец: ОАО «Хмелево» 225127, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Хмелево, ул. Центральная, 66, тел./факс 80164162533. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 10 дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 03 ноября 2023 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Последний день приема заявлений – 02 ноября 2023 г. до 17.00

ЕЎРОПА КІШЫЦЬ КЛАПАМІ

Чаму Стары Свет акупавалі крывасмокі?

Нечакана адным з галоўных глабальных «ньюсмейкераў» апошнім часам сталі... клапы. Навіны аб тым, што шкоднікі лавінай пакараюць адну за адной еўрапейскія сталіцы, замацаваліся ў «топе» стужкі паведамленняў інфармацыйных агенцтваў. Уся сусветная прэса з'едліва каментуе нябачаную ў XXI стагоддзі падзею, а палітыкі мітусліва шукаюць магчымыя варыянты выйсця з цяжкай сітуацыі, паколькі апроч масавага псіхозу нашэсце клапоў прынесла і адчувальныя эканамічныя страты. Чаму ж «цывілізаваны» Стары Свет акупавалі крывасмокі, чаго чакаць надалей?

ПАРАЗІТЫ НА ТЫДНІ МОДЫ

У Францыі клапы пазапаўнялі метро, цягнікі, бальніцы, кіназалы і школы. Іх выявілі і ў аэрапорце Шарль дэ Голь. У Марселі з-за шкоднікаў вымушаны быў зачыніцца нядаўна пабудаваны каледж імя Жазэфіны Бэйкер, прычым дакладна невядома, калі ён адновіць заняткі, паведаміў vz.ru. Міністр адукацыі Францыі Габрыэль Аталь заклікаў да «неадкладнага рэагавання», каб навучальныя ўстановы тэрмінова былі ачышчаны ад насякомых, паведамляе агенцтва Reuters.

На мінулым тыдні французскі ўрад правёў серыю сустрэч для вывучэння прычын імклівага росту колькасці зарэгістраваных выпадкаў выяўлення клапоў. Усё гэта адбываецца ў той момант, калі Францыя прымае фінальную частку дзясятага чэмпіяната свету па рэгбі. У сталіцы краіны нядаўна прайшоў традыцыйны Тыдзень моды. А тут — такое. «Калі ў Парыжы завяршаецца Тыдзень моды, не Balenciaga, Dior і Chanel аказваюцца цвіком праграмы. Самая буйная новая тэндэнцыя, якую могуць пераняць ЗША, насамрэч нечаканая — гэта клапы», — пісаў Newsweek. Яго паўтарала газета New York Times: «Найлепшыя парады для Тыдня моды ў Парыжы? Пазбягаць клапоў».

Па словах міністра адукацыі, клапы былі выяўленыя ў шакавальнай колькасці лакацый: «Мне вядома як мінімум аб 17 установах. Сем з іх ужо зачыненыя па прычыне выяўлення насякомых. У нас амаль 60 тысяч установаў адукацыі, і мы пакуль гаворым толькі аб некалькіх дзясятках, але колькасць зафіксаваных выпадкаў павялічваецца».

Паводле даных прафесійнай асацыяцыі дэзынсектараў, сёлета з чэрвеня да жніўня ў Францыі было праведзена на 65 працэнтаў больш акцый па барацьбе з клапамі, чым за той жа перыяд мінулага года. У цэлым колькасць выпадкаў пастаянна павялічваецца з 2020-га, адзначаюць у асацыяцыі. Ужо некалькі тыдняў абураныя французы размяшчаюць у сацыяльных сетках відэаролікі са шкоднікамі і наступствамі іх укусаў.

СПРАВА ДЛЯ... САБАК-СЫШЧЫКАЎ

Звычайна праблема абмяжоўвалася гасцініцамі і жылымі дамамі. Аднак з нядаўняга часу маштабы настолькі жахлівыя, што мэрыя Парыжа запатрабавала ад дзяржавы прыняцця тэрміновых мер па барацьбе з гэтай праблемай. Напярэдадні Алімпійскіх гульняў 2024 года нават збіраюцца стварыць спецыяльную аператыўную групу.

У лісце, які адрасаваны прэм'ер-міністру Элізабэт Борн, мэрыя Парыжа заклікала прыняць меры па барацьбе з праблемай клапоў у горадзе. «Пасцельныя клапы — сапраўдная бяда для грамадскай аховы здароўя, і з ёй варта змагацца, — напісаў намеснік мэра горада Эмануэль Грэгуар. — Дзяржава павінна тэрмінова сабраць разам усе зацікаўленыя бакі, каб распрацаваць план дзеянняў, сувымерны гэтаму бедству. Бо ўся Францыя рыхтуецца прыняць Алімпійскія і Паралімпійскія гульні ў 2024 годзе».

«Менш чым за год да таго, як мільёны людзей прыбудуць у Парыж на Алімпійскія гульні, хваля паведамленняў аб заражэнні клапамі аказвае ціск на французскія ўлады», — пісала New York Times. Французскі ўрад адказаў мэрыі стандартным наменклатурным наборам штампаў: маўляў, робяцца ўзгодненыя намаганні па барацьбе з клапамі, якія ў вялікай колькасці з'явіліся ў грамадскім транспарце, кінатэатрах і шпіталях. Міністр транспарту Клемент Бон заявіў, што збярэ прадстаўнікоў аператараў грамадскага транспарту, «каб праінфармаваць іх аб контрмерах і пра тое, як абараніць пасажыраў». Напрыклад, мяркуецца, што французскія цягнікі і парыжскі грамадскі транспарт, у тым ліку метро, праверацъ спецыяльныя сабакі-сышчыкі, якія скіраваны на выяўленне клапоў.

Паразіты сталі і палітычнай праблемай у Францыі. Лідар парламенцкай групы партыі «Непакораная Францыя» Мацільда Пано, трасучы шклянкай, напоўненай пасцельнымі клапамі, звярнулася да прэм'ер-міністра Элізабэт Борн: «У 2022 годзе налічвалася 1,2 мільёна заражаных месцаў. Вы схлусілі ў міністэрскім плане, дзе не было ніякіх абавязковых мер. Абсерваторыя, аб стварэнні якой было абвешчана, так і не з'явілася. Няўжо мы павінны чакаць, пакуль Матыньён (рэзідэнцыя французскага прэм'ер-міністра. — **Рэд.**) будзе заражаны, перш чым вы нарэшце адрэагуеце?»

Клапы, якія ў асноўным зніклі з паўсядзённага жыцця французаў да 1950-х, у апошнія дзесяцігоддзі зноў распладзіліся. Гэта звязваюць з павелічэннем шчыльнасці насельніцтва ў Парыжы (у тым ліку за кошт міграцыйных хваляў), а таксама... ростам колькасці грамадскага транспарту. Паводле звестак Нацыянальнага агенцтва па бяспецы харчовых прадуктаў, навакольнага асяроддзя і здароўя на рабочым месцы (Anses), за апошнія некалькі гадоў пасцельныя клапы праніклі ў кожную дзясятую хатнюю гаспадарку Францыі. У перыяд з 2017 да 2022 года французы штогод выдаткоўвалі па 230 мільёнаў еўра на барацьбу з паразітамі.

Тым часам усё больш французскіх дамоў ператвараюцца ў клапоўнікі, і ў прэсе ідуць гарачыя дыскусіі, з якога боку падступіцца да гэтай праблемы, адзначае vz.ru. Пакуль жыхарам, якія заўважылі клапоў у сябе дома, рэкамендуецца мыць вопратку і пасцельную бялізну ў гарачай вадзе (больш за 55 градусаў), апрацоўваць парай мяккую мэблю і замазваць шчыліны ў пакоях. Парады выдатныя, але, мяркуючы па развіцці падзей, пакуль не падобна, каб яны працавалі. Барацьба з паразітамі патрабуе комплекснай апрацоўкі, заўважае vz.ru. Груба кажучы, калі ўвесь дом заражаны клапамі, то барацьба з імі ў адной кватэры не дапаможа: займацца трэба менавіта ўсім домам. І якраз з гэтым маюцца некаторыя праблемы, таму што няма такога закона, які абавязаў бы ўласнікаў жылля выводзіць клапоў. Дакладней, ён ёсць, але ўласнік заўсёды можа заявіць, што паразітаў прыцягнуў у дом жыхар — а значыць, ён і павінен плаціць за санапрацоўку.

НЯПРОШАНЫЯ «ТУРЫСТЫ»

Паразіты асвойваюць Еўропу — стала вядома, што жыхары Вялікабрытаніі пакутуюць ад клапоў, якія запаланілі іх дамы і гарадскі транспарт. Колькасць выпадкаў заражэння кватэр брытанцаў шкоднікамі павялічылася на дзве траціны з 2022 да 2023 года, перадае Sky News са спасылкай на даныя мясцовай службы дэзынфекцыі Rentokil. Сітуацыя ў Злучаным Каралеўстве нават перасягнула маштабы Францыі. Па падліках мікрабіёлага і заснавальніка кампаніі Bed Bugs Дэвіда Кейна, маштабы эпідэміі ўражваюць: «Я чуў статыстыку, згодна з якой за апошнія два гады ў Парыжы заражаны кожны дзясяты дом. Я сказаў бы, што тут, у Лондане, за апошнія 4 ці 5 гадоў гэта, верагодна, бліжэй да аднаго з пяці дамоў».

Як растлумачылі ў брытанскай асацыяцыі па барацьбе са шкоднікамі, тэмпы росту калоній пасцельных клапоў пашыраюцца ўлетку, калі людзі больш падарожнічаюць. Акрамя таго, спецыялісты адзначаюць рост імунітэту паразітаў да дусту — апошнім часам самага папулярнага інсектыцыду. Выпадкі заражэння клапамі асабліва пачасціліся пасля зняцця каранавірусных абмежаванняў. Шкоднікаў можна нярэдка заўважыць у цягніках, гарадскім грамадскім транспарце, кінатэатрах і бальніцах.

Жыхары Бельгіі ўсё часцей сталі ў прафілактычных і не толькі мэтах заказваць санітарную апрацоўку жылля ад насякомых, паведаміла РІА «Навіны». Так, у бельгійскім Льежы кампаніі, якія займаюцца дэзынсекцыяй, фіксуюць 30-працэнтны рост попыту на свае паслугі. Спецыялісты папярэджваюць, што клапоў у Бельгію, хутчэй за ўсё, завозяць у транспарце і ў асабістых рэчах, якія прыязджаюць з Францыі, а таксама «адпускнікі», якія вяртаюцца дадому з-за мяжы. Між тым транспартныя ўлады Бельгіі паведамілі, што ў бельгійскіх цягніках, аўтобусах, трамваях і метро клапоў пакуль не выяўлена, у тым ліку з-за строгіх санітарных правілаў, а таксама з-за таго, што сядзенні выраблены з пластыку і скуры, у якіх гэтыя шкоднікі не жывуць.

Выпадкі з'яўлення клапоў адзначаны і ў турыстычных раёнах Грэцыі, паведаміла грэчаскае грамадскае тэлебачанне ERT. Праблема існавала заўсёды, заявіў тэлеканалу кіраўнік Грэчаскай асацыяцыі вытворцаў прэпаратаў для дэзынсекцыі і дэзынфекцыі Ёргас Ламбру. Паводле яго слоў, гаворка ідзе пра насякомых-вандроўнікаў, якія могуць лёгка пракрасціся ў багаж і такім чынам пераправіцца ў любы пункт свету, куды заўгодна, яго можна знайсці ў грамадскім транспарце, гэта значыць, на караблях, самалётах ці аўтобусах. Грэчаскія СМІ публікуюць «карысныя парады» экспертаў аб тым, як праверыць гатэль на наяўнасць клапоў і не прывезці іх з сабой: трымаць багаж далей ад дывановых пакрыццяў, у цемры правяраць ложак, уважліва аглядаць крэслы і канапы з тканіны, апырскваць багаж алеем чайнага дрэва, мяты і лаванды.

У Венгрыі выпадкі з'яўлення шкоднікаў застаюцца адзінкавымі, а трывогу больш выклікаюць не пасцельныя клапы, а завезеныя з Азіі пладовыя, якія наносяць шкоду садавіне і гародніне. У Фінляндыі таксама не бачаць падстаў для турботы, з цікавасцю назіраюць за тым, што адбываецца ў Парыжы. Улады перакананы, што эпідэмія такога маштабу краіне не пагражае. Між тым у кампаніі Anticimex, найбуйнейшай у краіне па барацьбе са шкоднікамі, адзначылі, што кожны год праводзяць некалькі тысяч аперацый па барацьбе з гэтымі паразітамі па ўсёй краіне.

Хуткі рост папуляцыі пасцельных клапоў пагражае ў тым ліку і Эстоніі, паведамляе партал ERR. Як адзначаецца ў артыкуле, прычыны, па якіх папуляцыя рэзка ўзрасла, пакуль застаюцца загадкай. Па словах энтамолага з Тартускага ўніверсітэта Маці Марціна, пасцельныя клапы родам з Міжземнамор'я і любяць цяпло, так што жылыя дамы з'яўляюцца для іх прыдатным асяроддзем. Адна з прычын, чаму гэтых паразітаў стала так шмат, можа быць звязаная са з'яўленнем новай мутацыі, якая павышае іх актыўнасць, выказаў здагадку спецыяліст. Акрамя таго, людзі сталі больш падарожнічаць, што таксама можа спрыяць распаўсюджванню паразітаў.

«ХУТКА ВОШЫ ПОЙДУЦЬ»

Нашэсце пасцельных клапоў на шэраг краін Заходняй Еўропы азначае, што замежныя госці могуць прывезці крывасмокаў і на расійскую тэрыторыю, распавёў «Парламенцкай газеце» намеснік кіраўніка камітэта расійскай Дзярждумы па пытаннях сям'і, жанчын і дзяцей Віталь Мілонаў. «Дыпламатаў з недружалюбных краін я апырскваў бы. Хуткa вошы пойдуць. Я турбуюся, каб тыфу не было. Але мы можам не апасацца ўсур'ёз: рускія людзі заўсёды любілі лазню, любілі мыцца, і нам гэта не пагражае», — выказаў меркаванне Віталь Мілонаў. Як заўважыў у гутарцы з выданнем акадэмік РАН, доктар медыцынскіх навук, былы галоўны санітарны ўрач Расіі Генадзь Аніщанка, акрамя фактару бежанцаў у распаўсюджванні клапоў адыграла ролю і дарагоўля газу, з-за якой еўрапейцы вымушаныя эканоміць ваду, напрыклад пры наведванні ваннай.

Тэму нашэсця клапоў актыўна абмяркоўваюць і ў тэлеграм-канале «Сапраўдная Францыя». У каментарыях да тэматычнага паста карыстальнікі адзначаюць, што ў краіне папросту адсутнічае дзяржаўная санітарная служба, якая магла б належным чынам арганізаваць барацьбу з нашэсцем насякомых. Акрамя таго, кошт дэзынсекцыі на фоне павышанага попыту на гэтую паслугу ўзрос да 2–3 тысяч еўра. Барацьба з нямытымі гасцямі выліваецца ў сур'ёзныя выдаткі для сямейнага бюджэту, якія далёка не кожны пацягне. Таму, лічаць інтэрнэт-карыстальнікі, перспектыў для аператыўнага вырашэння праблемы пакуль не праглядаецца. «Некаторыя турысты імкнуцца адмяніць свае паездкі і запатрабаваць вяртання грошай, — піша Independent. — Ёсць апасенні, што праблема яшчэ больш пагоршыцца напярэдадні Алімпійскіх гульняў у Парыжы наступным летам».

Захар БУРАК.

ЗВЫШГЕРАІЗМ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ

У кожнага горада — свой характар, свой лёс. У гарадскога пасёлка Лоеў на Гомельшчыне ён вызначаны яшчэ і падзеямі 1943 года. Лоеўскі плацдарм стаў эпіцэнтрам адной з самых маштабных аперацый Вялікай Айчыннай вайны, якая ўвайшла ў сусветную гісторыю як этап бітвы за Дняпро. Сёння (14 кастрычніка) раённы цэнтр адзначае 80 гадоў мірнага, свабоднага жыцця. З гэтых мясцін пачалося вызваленне Беларусі ад гітлераўскай акупацыі. Новы праект «Шляхамі вызвалення» да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прапануе аднавіць у памяці подзвіг савецкіх воінаў. Карэспандэнт «Звязды» пераканалася: памяць аб Вялікай Айчыннай вайне займае асаблівае месца ў сэрцах жыхароў Лоеўшчыны.

Да святкавання 70-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне цэнтральная плошча Лоева была пераўтворана ў мемарыяльны комплекс «Бітва за Дняпро».

ВЫНІКІ АКУПАЦЫІ

У самыя радасныя і самыя ўрачыстыя дні свайго жыцця лаяўчане прыходзяць на цэнтральную плошчу. Гэта месца на беразе Дняпра — святое. Тут аддаюць пашану загінулым вызваліцелям гарпасёлка. Самую шчырую ўдзячнасць у сэрцы нясуць і госці Лоева, якія прыязджаюць сюды, каб дакрануцца да гераічнага савецкага мінулага.

Да вайны гэта тэрыторыя славілася развітой сельскай гаспадаркай: працавала шмат малочнатварных ферм і прамкамбінат. На Лоеўшчыну нямецка-фашысцкія захопнікі прыйшлі ў жніўні 1941 года. Падчас акупацыі 24 вёскі раёна падзялілі лёс Хатыні, 27 населеных пунктаў былі часткова знішчаны захопнікамі. Ахвярамі трагедый населеных пунктаў сталі больш за 1500 жанчын, дзяцей і старых. Больш за 700 чалавек загінулі падчас акупацыі, 2500 мясцовых жыхароў былі сагнаны ў рабства. Па сабраных пасля вызвалення сведчаннях, фашысты ў Лоеве расстрэльвалі мірнае насельніцтва ў супрацьтанкавым рове і на тэрыторыі былога прамкамбіната. Дзейнічала яўрэйскае гета адкрытага тыпу і лагер прымусовага ўтрымання людзей. Вядома, што перад тым, як адыходзіць з гарпасёлка, акупанты пераарэлі тэрыторыю каля супрацьтанкавага рова з астанкамі людзей, каб не было магчымасці дакладна ўстанавіць, колькі чалавек тут расстраляны. Калі ў 1943 годзе пасля паражэння нямецкіх войскаў пад Сталінградам пачалося іх маштабнае адступленне, фашысты знішчалі любую інфраструктуру, пакідалі пасля сябе «выпаленую зямлю».

«УСХОДНІ ВАЛ»

Менавіта на тэрыторыі Лоеўскага раёна праходзіў стратэгічны абарончы рубеж гітлераўцаў — Усходні вал.

— Яго асноўныя ўмацаванні праходзілі па правым беразе Дняпра. Вораг улічыў асаблівасці ракі, правы бераг якой практычна на ўсім сваім шляху значна ўзвышаецца адносна нізкага і плоскага левага берага. Вядомы выраз Гітлера: «Хутчэй Дняпро пацячэ назад, чым рускія возьмуць «Усходні вал», — нагадвае **дырэктар Музея бітвы за Дняпро ў гарпасёлку Лоеў Гомельскай вобласці Вікторыя ЯШЧАНКА.** — Немцы былі перакананы, што гэта мяжа абароны стане непрыступным бар'ерам для Чырвонай Арміі. Вораг прадбачыў велізарнае значэнне і Лоеўскага плацдарма. На гэтым участку было створана некалькі ліній абароны.

ФАРСІРАВАННЕ РАКІ

Рух савецкіх войскаў да Дняпра, распачаты ў жніўні 1943-га, адбываўся паэтапна, быў абцяжараны моцным супраціўленнем ворага. Да сярэдзіны верасня Чырвоная Армія ў асноўным дасягнула пастаўленай мэты — была вызвалена значная частка Левабярэжнай Украіны, савецкія войскі падышлі да мяжы Беларусі. У верасні, падчас Чарнігаўска-Прыпяцкай наступальнай аперацыі, вызвалены першы беларускі населены пункт — гарпасёлак Камарын Брагінскага раёна. Асноўныя намаганні Цэнтральнага (Беларускага) фронту нацэлілі на гомельскі напрамак. Савецкім войскам трэба было прарваць умацаванне нямецкіх пазіцый «Усходняга вала» на ўчастку міжрэчча Дняпра і Сожа.

Камандуючы фронтам генерал войска Канстанцін Ракасоўскі ў сваіх успамінах так апісваў падзеі таго часу: «У паласе дзеянняў войскаў фронту, у межах Беларусі на асноўным і вельмі для нас важным напрамку знаходзіўся буйны абласны прамысловы цэнтр Гомель. Хуткае авалодванне гэтым горадам з'яўлялася важнай задачай па аператыўных і палітычных меркаваннях. Гэта ўлічваў і сапернік, які прыняў усе меры да ўтрымання за сабою горада і навакольля. Гомель быў размешчаны ў паласе асноўнай абароны немцаў. Шырока быў ужыты намі манеўр сіламі і сродкамі з перакідваннем нашых войск з аднаго ўчастка на другі. Гэта дазволіла добра і ўстойліва падрыхтаваць фарсіраванне ракі Дняпро ў раёне Лоева, якое бліскуча ажыццявілі часці 65-й арміі».

Унікальныя ваенныя кадры фарсіравання ракі захоўваюцца ў фондах Музея бітвы за Дняпро ў Лоеве.

Яе падраздзяленні 28 верасня фарсіравалі Сож у раёне вёскі Карпаўка. Нямецкае камандаванне аператыўна перакінула з-пад Гомеля ў міжрэчча Дняпра і Сожа значныя сілы падмацавання. Тады камандуючы войскамі Беларускага фронту генералам Канстанцінам Ракасоўскім і было прынята рашэнне перагрупаваць асноўныя сілы 65-й арміі з гомельскага напрамку ў раён Лоева. У дняпроўска-сожскім міжрэччы ў гомельскім напрамку засталося некалькі падраздзяленняў, якія павінны былі стварыць бачнасць нарошчвання сіл савецкімі войскамі нібыта для ажыццяўлення прарыву да абласнога цэнтра.

Як нашы войскі рыхтаваліся да гэтай аперацыі, у сваёй кнізе «У паходах і баях» апісаў двойчы Герой Савецкага Саюза, камандуючы 65-й арміяй генерал Павел Іванавіч Батаў. У кастрычніку 1943 года менавіта 65-я армія Батава ва ўзаемадзеянні з 61-й арміяй генерала Бялова фарсіравала раку Днепр і захапіла плацдарм у раёне Лоева:

Сапраўдным подзвігам падчас фарсіравання Дняпра стала ўзвядзенне моста: пад бомбавымі ўдарамі нямецкай авіяцыі чырвонаармейцы пры падтрымцы мясцовых жыхароў за адны суткі ўручную паставілі 400 метраў пераправы.

«У першыя дні толькі вузкае кола людзей — члены Ваеннага Савета войска, камандзіры карпусоў і дывізій — ведалі, куды і навошта перамяшчаецца войска... Былі прыняты ўсе меры, каб забяспечыць скрытнасць і дэзарыентаваць сапернікa... Працавалі радыёстанцыі карпусоў, імітуючы сувязь з дывізіямі на плацдарме. У лясах на ўсходнім беразе дзень і ноч палілі шматлікія вогнішчы: нехай вораг лічыць, што нашы войскі не толькі нікуды не перакідваюцца, а, наадварот, усё больш падцягваюцца. Уначы часці ішлі па шашы Гомель — Чарнігаў у новы раён. Днём узмацняўся рух аўтамашын у зваротным напрамку — у бок сожскіх плацдармаў... У раёнах засяроджвання часці маскіраваліся ў лясах. Асноўныя сілы размяшчаліся за 5-6 кіламетраў ад Дняпра, другія эшалоны — за 6-8 кіламетраў... Перагрупоўкай у раён Лоеў — Радуль вырашалася асноўнае пытанне наступлення — стварэнне безумоўнай перавагі сіл на абраным напрамку галоўнага ўдару...»

ЗВЫШХРАБРАСЦЬ

Першымі на правы бераг Дняпра каля вёскі Крупейкі пад Лоевам высадзіліся разведчыкі 20-й асобнай разведроты 69-й стралковай дывізіі, услед за імі пераправіліся байцы 2-га дэсантнага батальёна 120-га стралковага палка.

«Разведвальныя даныя 61-й арміі, аэрафотаздымка і назіранні нашай разведкі паказалі, што на супрацьлеглым беразе немцы мелі каля 18 пяхотных батальёнаў, 96 станкавых і 250 ручных кулямётаў, 330 гармат і мінамётаў. Пры рацэ шырынёй 400 метраў і глыбінёй 7-8 метраў абарона праціўніка складалася з дзвюх ліній траншэй з хадамі паведамлення поўнага профілю. Першая суцэльная траншэя — каля ўрэзу вады, другая — па высокім старым беразе; там — акопы артылерыі для вядзення агню прамым навядзеннем. Населеныя пункты і асобныя пабудовы прыстасаваны да працяглай абароны, асабліва вёска Шытцы», — апісаў лініі абароны ворага ў кнізе «У паходах і баях» генерал Павел Іванавіч Батаў.

Чырвонаармейцы, сярод якіх былі і байцы штрафных рот, дзейнічалі бясстрашна. Уварваўшыся ў нямецкую траншэю, яны ў рукапашным баі авалодалі ўмацаваннем. Ужо праз гадзіну пасля пачатку прарыву на Лоеў чырвонаармейцамі была захоплена безназоўная вышыня вёскі Шытцы.

— Варта разумець, вышыня берага ракі на ўчастку Лоеўскага раёна дасягала 16 метраў, і ён быў амаль пад 90 градусаў, — дадае дырэктар музея «Бітва за Дняпро» Вікторыя Яшчанка. — Захоўваецца макет лодкі, якую салдаты выкарыстоўвалі падчас фарсіравання ракі. Лодкі былі разлічаны на 7-8 чалавек. Мяшкі, шчыльна набітыя саломай, прывязвалі да кармы, каб у выпадку перакульвання быў шанц патрымацца на вадзе.

Сярод тых, хто паспяхова фарсіраваў Дняпро 15 кастрычніка, быў легендарны батальён пад камандаваннем маёра Уладзіміра Несцерава. Байцы бліскуча ажыццявілі дэсант паўночней вострава Хаўранкоў. За подзвігі пры фарсіраванні Дняпра і ўтрыманні плацдарма 22 воіны гэтага батальёна былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, некаторыя — пасмяротна. Прыкладам мужнасці для таварышаў стаў малодшы лейтэнант Пётр Акуцыёнак. У вырашальную хвіліну бою камандзір узвода малодшы лейтэнант Акуцыёнак з чырвоным сцягам у руках кінуўся на пазіцыі ворага. Натхнёныя смеласцю камандзіра, салдаты рушылі ўслед. Гітлераўцы не вытрымалі націску, пазіцыя была ўзятая. Акапаўшыся, батальён утрымліваў яе да падыходу падмацавання. За подзвіг пры фарсіраванні Дняпра на

ДНЯПРОЎСКІХ КРУЧ

ўчастку ў раёне Лоева малодшаму лейтэнанту Акуцыёнку пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Між тым 16 кастрычніка баі на Дняпры каля Лоева працягнуліся. З самай раніцы падраздзяленні 65-й арміі пад шквалістым агнём сапернікі працягвалі перапраўляцца праз раку. Ужо бліжэй да поўдня стралковыя карпусы занялі пазіцыі на правым беразе Дняпра і пры падтрымцы штурмавой авіяцыі перайшлі ў наступ. У выніку скаардынаваных дзеянняў падраздзяленняў удалося не толькі зламаць супраціўленне ворага, але і да 16 гадзін поўнасцю ачысціць ад фашыстаў гарпасёлак Лоеў. Цалкам тэрыторыю Лоеўскага раёна вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 22 лістапада. Менавіта з узяцця Лоеўскага плацдарма 10 лістапада 1943-га пачалася Гомельска-Рэчыцкая наступальная аперацыя. 26 лістапада быў вызвалены першы абласны цэнтр Беларусі — Гомель.

Дырэктар Музея бітвы за Дняпро Вікторыя ЯШЧАНКА натхняе сваіх землякоў вывучаць і захоўваць гераічную спадчыну беларускага народа.

ПЛАЦДАРМ ГЕРОЯЎ

— За кожным гераічным эпізодам той бітвы — лёс канкрэтных людзей, жыццё, якое яны аддалі за родную зямлю. У той час пісалі, што толькі стальная сіла духу і звышхрабрасць савецкіх воінаў дазволілі парушыць нямецкі план непрыступнай абароны «Усходняга вала». Усяго за фарсіраванне Дняпра званні Герой Савецкага Саюза атрымалі 2438 чалавек. За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры штурме «Усходняга вала» пачынаецца ўзбуйненне калгасаў — замест 57 дробных гаспадарак створана 19. У 1962-м у Лоеве пабудаваны бальнічны гарадок і сярэдняя школа. У снежні 1962 года Лоеўскі раён рэарганізаваны, а яго тэрыторыя перададзена Брагінскаму і Рэчыцкаму раёнам. Праз год у гарпасёлку адкрылі педагагічнае вучылішча. З ліпеня 1966 года на цэнтральнай плошчы Лоева ў гонар воінаў 61-й, 65-й і 16-й паветранай армій, якія вызвалялі раён, устаноўлены 18-метровы «Манумент Славы». 1 жніўня 1966 года Лоеўскі раён адноўлены. У год 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Указам Прэзідэнта Беларусі гарпасёлак Лоеў узнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Пляцоўка ваеннай тэхнікі працягвае экспазіцыю Музея бітвы за Дняпро.

на тэрыторыі Лоеўскага раёна, узнагароды ўдастоіліся 365 чалавек! Гэта своеасаблівы рэкорд, — звяртае ўвагу Вікторыя Яшчанка.

Па яе словах, ужо ў 1944 годзе лаяўчане сталі вяртацца дадому, аднаўлялі свае вёскі. Лоеўскімі музейшчыкамі сабраны ўспаміны мясцовых жыхароў, як, напрыклад, аднаўлялася навучанне ў школе — будынку без вокнаў, калі катастрафічна не хапала паперы для заняткаў.

— Людзі знайшлі ў сабе сілы аднавіць раён, народную гаспадарку, выжывалі, дапамагалі адно аднаму. Натуральна, што некалькі сем'яў сяліліся ў лепшым выпадку ў хаце з адной печчу, але ўсё роўна былі шчаслівыя, што ўсё скончылася. Наогул, людзі, якія прайшлі вайну, перажылі ўвесь той жах, разумелі каштоўнасць кожнага мірнага дня, — дадае Вікторыя Аляксандраўна.

У пачатку 1944 года прынятая сумесная пастанова Лоеўскага райвыканкама і РК КП(б)Б аб аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі. У 1950 годзе

ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ

Славутасць Лоева — Музей бітвы за Дняпро на постсавецкай прасторы — адзіная музейная ўстанова, экспазіцыя якой прысвечана гісторыі фарсіравання Дняпра і прарыву «Усходняга вала». Музей быў адкрыты 9 мая 1985 года. У яго фондах — звыш чатырох тысяч экспанатаў. Экспазіцыі прысвечаны падзеям фарсіравання Дняпра ў Гомельскай вобласці войскамі Цэнтральнага фронту, баявым дзеянням 61-й і 65-й армій на Лоеўскім плацдарме і вызваленню тэрыторыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У экспазіцыі таксама — матэрыялы аб партызанскім руху на Лоеўшчыне, земляках — героях Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць сродкі пераправы першых паветрана-дэсантных войскаў, баявая амуніцыя, калекцыя зброі, баявыя ўзнагароды, франтавыя лісты і паштоўкі, фатаграфіі, асабістыя рэчы і дакументы ўдзельнікаў бітвы за Дняпро.

У 2015 годзе была праведзена рэканструкцыя цэнтральнай плошчы Лоева пад мемарыяльны комплекс «Бітва за Дняпро». Так экспазіцыя музея падоўжылася адкрытай пляцоўкай вайсковай тэхнікі, дзе размясціліся супрацьтанкавая і дывізіённая гарматы, гаўбіцы, цяжкая самаходная ўстаноўка, танк, легендарная баявая машына, вядомая народным прозвішчам «Кацюша».

На цэнтральнай плошчы Лоева на Алеі Герояў залатымі літарамі нанесены імёны воінаў, удастоеных звання Героя Савецкага Саюза за баі на лоеўскім плацдарме.

ІМЁНЫ, ЯКІЯ НЕЛЬГА ЗАБЫВАЦЬ

— Жыхары Лоева і раёна захоўваюць светлую памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі Лоеўшчыны — 38 воінскіх пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны, дзе пахавана звыш 12 тысяч воінаў, з іх 43 — Героі Савецкага Саюза, — адзначае дырэктар Музея бітвы за Дняпро Вікторыя Яшчанка.

Супрацоўнікі музея сумесна з гісторыкамі працягваюць работу па ўстанаўленні імён загінулых у гады вайны.

— Удакладняюцца новыя спісы беззваротных страт. Апошняе імя, якое ўдалося ўстанавіць сёлета, — Ангеліны Насовай. Яна была сапёрам і загінула пры размініраванні вёскі Астравы Лоеўскага раёна, — дадае дырэктар.

Вікторыя Аляксандраўна падкрэслівае, што сёння іх установа выконвае вялізную патрыятычную і педагагічную задачу.

— Падзеі ваенных гадоў — ужо гісторыя, гісторыя гераічная, якую мы не маем права забываць. Сучасным дзецям, здараецца, складана гэта асэнсаваць. Але дзеці і падлеткі шчыра, са слязамі на вачах рэагуюць і запамінаюць жыццёвыя гісторыі герояў, — тлумачыць Вікторыя Яшчанка. — Расказваем пра 18-гадовага разведчыка, Героя Савецкага Саюза Барыса Царыкава, пахаванага ў брацкай магіле ў Лоеве. У баях за пераправу на Дняпры ён разам з групай мінёраў самым першым фарсіраваў раку, пад ураганным агнём саперніка першым урываўся ў траншэі фашыстаў з аўтаматам і ручнымі гранатамі, знішчаў ворагаў, тым самым забяспечыў пераправу 1-га стралковага батальёна. 15 кастрычніка 1943-га пад шквалістым агнём Барыс Царыкаў пяць разоў пераправіўся праз Днепр, падабраў больш за 50 чырвонаармейцаў з розных часцей, арганізаваў іх у групы і звёў у баявыя парадкі батальёна. У наступных баях за пашырэнне плацдарма на правым беразе Дняпра 18-гадовы хлопец ішоў у атаку ў першых радах, натхняў асабістым прыкладам іншых байцоў на баявыя подзвігі. Просім моладзь прадставіць, што перажывалі героі, калі рызыкавалі жыццём за радзіму, выратоўвалі сваіх баявых таварышаў. Гэта вельмі важна, каб увогуле зразумець, хто такі сапраўдны патрыёт.

Унікальныя ваенныя кадры баявой падрыхтоўкі чырвонаармейцаў перад фарсіраваннем Дняпра.

З гонарам землякі згадваюць гісторыю камандзіра ўзвода разведкі 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі Ірыны Паповай. Жанчына і яе байцы забяспечвалі вельмі важнымі данымі, рэкагнасцыроўкамі фашыстаў падраздзяленні 61-й і 65-й армій. Ірына Папова загінула на тэрыторыі Лоеўскага раёна і знайшла вечны спачын у вёсцы Дзеражычы. У гэтым населеным пункце знаходзіцца самае буйное воінскае пахаванне — 2032 салдаты і афіцэры, загінулыя пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Лоеўскага раёна, 12 з пахаваных воінаў — Героі Савецкага Саюза.

У гісторыю вызвалення малой радзімы сваё імя ўпісаў і просты вясковы жыхар. Фёдару Іванавічу Чучвагу падчас вайны было за 50 гадоў, ён разабраў свой дом, каб зрабіць лодкі для чырвонаармейцаў. Са жніўня 1941 года да кастрычніка 1943-га вясковец перавозіў праз Днепр лоеўскіх партызан атрада «За Радзіму», а часам і гомельскіх, з атрада «Бальшавік». Падчас вызвалення раёна дзясяткі разоў Фёдар Іванавіч пабываў на правым беразе Дняпра і перавёз на лодцы каля 400 байцоў і афіцэраў, а таксама вялікую колькасць боепрыпасаў.

Увогуле, сярод жыхароў Лоеўшчыны — пяць Герояў Савецкага Саюза. У гарпасёлку ў гонар аднаго з іх — Аляксея Васільевіча Казлова — названа школа. Гэтага ўраджэнца Лоева называюць беларускім Марэсьевым. Аляксей Васільевіч здзейсніў больш за 246 баявых вылетаў. У сакавіку 1944 года падчас задання быў збіты фашыстамі. Дзякуючы свайму майстэрству лётчык пасадзіў машыну за лініяй фронту, шэсць сутак цяжка паранены дабіраўся да сваёй часці. У шпіталі лётчыку ампутавалі абмарожаныя ногі. Працягнуў службу лётным інструктарам. Цікавы факт: у 1948 годзе Аляксей Васільевіч Казлоў вярнуўся ў родны Лоеў і адкрыў першую ў гарпасёлку дзіцячую бібліятэку.

— Дзеці бачаць, як у нашай краіне шануюць памяць аб загінулых героях Вялікай Айчыннай вайны, як мы даглядаем брацкія пахаванні, працягваем пошукавыя работы, каб устанавіць кожнае імя, — звяртае ўвагу дырэктар Музея бітвы за Дняпро Вікторыя Яшчанка. — Дзяцей і падлеткаў гэта вельмі кранае і натхняе вывучаць і захоўваць гераічную спадчыну нашага народа.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота аўтара
і з архіва Музея бітвы за Дняпро.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «АвтоЮла» (продавец) в лице антикризисного управляющего Потапченко Д.А. извещает о проведении 31 октября 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-103423**, общей площадью **79,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное основное строение, кирпичная пристройка, навес, две площадки, бордюр, два забора, ворота, покрытие). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000007005707** общей площадью **0,0241 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А. **Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации и обслуживания склада	**32 940,00**	1 647,00	**1 647,00**

Продавец: ООО «АвтоЮла», 246021, г. Гомель, ул. Севастопольская, 39А. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (044) 773-34-28** – Потапченко Дмитрий Анатольевич (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества). **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 октября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 27 октября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить все затраты, связанные с организацией и проведением торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **7 (семи) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 12.08.2023 г. № 155 (30035). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (044) 599-18-16, 8 (0232) 23-23-56.

Информация о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Номер лота, местонахождение земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена, рублей
Лот № 1 к. п. Нарочь, ул. Садовая, 33	0,1316	624083390501000097	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	16 000
Дата, время и место проведения аукциона	**15 ноября 2023 г. в 11.00, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49, зал заседаний, Нарочский сельский исполнительный комитет**			
Извещение опубликовано	Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuyu-sobstvennost-01/) Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search) Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/ru/sformirovan-ru/			

УНП 600097530

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390
Продавец	Минское областное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24. УНП 600037767
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона

ЗДАНИЕ МАГАЗИНА

(доля: 31/50 из общ. пл. 128,6 кв. м, инв. № 630/С-79974). Адрес: **Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, д. Вязынка, ул. Гурновичи, 45.** Сведения о земельном участке: пл. 0,2345 га, предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля 31/50, срок действия по 12.12.2026) для обслуживания здания магазина-ФАПа. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона рек и водоемов (р. Вязынка, канал ВМВС, пруд), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В (пл. 0,0298 га)

Начальная цена лота с НДС 20 % – 26 514,58 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 17.11.2023 с 13.00 до 14.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.11.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

жилой дом № 3 (по генплану) в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр-та Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)»

Сведения о застройщике

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

Офис продаж: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, и фактические сроки их строительства:

- жилой дом № 11 по пер. 2-му Прилукскому в г. Минске – 12 мес.;

- жилые усадебные дома №№ 1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15, 17 по ул. Шатило, №№ 34, 38 по ул. Антоненко в микрорайоне Сокол в г. Минске – 10 мес.; жилые усадебные дома №№ 28, 30, 32 по ул. Докутович в микрорайоне Сокол в г. Минске – 11 мес.; жилые усадебные дома №№ 22, 26, 43, 45, 47, 51, 61 по ул. Докутович, №№ 30, 32, 36 по ул. Антоненко в микрорайоне Сокол в г. Минске – 12 мес.; жилые усадебные дома №№ 24, 49 по ул. Докутович и № 4-2 по ул. Шатило в микрорайоне Сокол в г. Минске – 13 мес.; жилые усадебные дома №№ 15, 19-1, 29-1, 31, 33-1, 41-2 по ул. Докутович и №№ 4-1, 6, 8-1, 10-2, 12, 20, 22-2, 28 по ул. Антоненко в микрорайоне Сокол в г. Минске – 14 мес.; жилые усадебные дома № 24 по ул. Антоненко, №№ 1, 5, 27-1, 29 по ул. Головачёва, №№ 18, 20-2 по ул. Шатило – 16 мес.; жилые усадебные дома №№ 8-1, 10-2, 16-1, 24-2 по ул. Шатило, № 3-1, 15-2, 25-2 по ул. Головачёва – 17 мес.; жилой усадебный дом № 27-2 по ул. Головачёва, № 19-2 по ул. Докутович – 22 мес.; жилой усадебный дом № 8-2 по ул. Антоненко – 23 мес.; жилой усадебный дом № 22-1 по ул. Антоненко, № 16-2 по ул. Шатило – 24 мес.; жилой усадебный дом № 10-1 по ул. Антоненко – 25 мес.;

- жилой дом № 4Д по ул. Семашко в г. Минске – 19 мес.;

- жилой дом № 4Е по ул. Семашко в г. Минске – 22 мес.;

- жилой дом № 21 по ул. Гризодубовой в г. Минске – 13 мес.;

- жилой дом № 32 по ул. Ромашкина в г. Минске – 16,5 мес;

- жилой дом № 19 по ул. Гризодубовой в г. Минске – 11,8 мес;

- 1, 2 секция жилого дома № 26 по пр-ту Дзержинского в г. Минске – 11,8 мес.

Информация о проекте строительства

Цель строительства – строительство жилого дома № 3 (по генплану) в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр-т Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)».

Срок начала строительства объекта – 27 июня 2022 года. Нормативная продолжительность строительства – 22,5 месяца. Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода его в эксплуатацию в соответствии с проектной документацией – 2 квартал 2024 года. 1, 2 секция жилого дома № 3 (по генплану) в составе объекта введены в эксплуатацию 02 июня 2023 года.

Строительство осуществляется на основании:

- решения Минского городского исполнительного комитета от 29.09.2022 № 3296 «Об изъятии, предоставлении земельного участка, разрешении строительства»;

- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу (заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» от 29.04.2022 № 166-15/22, от 10.08.2022 № 438-15/22, от 12.08.2022 № 502-15/22, от 14.11.2022 № 707-15/22);

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и прав на него № 500/1859-4697 от 15.11.2022;

- договора строительного подряда на строительство объекта от 27.09.2021 № 4/26-2021, заключенного с ОАО «Стройтрест № 4»;

- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 31.10.2022 № 2-203Ж-023/22.

Сведения об объекте строительства

Земельный участок для строительства объекта расположен в Московском районе г. Минска в границах ул. Щорса, ул. Земледельческой 2-й, ул. Лермонтова и пр-т Дзержинского. Земельный участок общей площадью 2,225 га предоставлен застройщику во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гараж-стоянками в границах пр-та Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)».

Жилой дом № 3 в составе объекта запроектирован четырехсекционным, 20-23-этажным 387-квартирным с теплым чердаком, подвалом, плоской рулонной кровлей и внутренним водостоком, состоит из 20-этажной секции № 1, из 23-этажных секций №№ 2, 3, 4. На 1 и 2 этажах со входами со стороны главного фасада размещаются встроенные помещения торгово-административного назначения, офисные помещения.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с монолитными перекрытиями с заполнением наружных стен блоками ячеистого бетона, межквартирные и межкомнатные перегородки – из блоков ячеистого бетона и кирпича. Отделка наружных стен – покраска фасадными красками, система вентилируемого фасада. Высота первого этажа (от пола до пола) – 4,2 метра. Высота остальных надземных этажей (от пола до пола – 3 м). Всего квартир в доме – 387, в том числе: 1-комнатных – 123, 2-комнатных – 162, 3-комнатных – 102.

В каждой секции жилого дома запроектировано 2 лифта грузоподъемностью 630 кг и 2 лифта грузоподъемностью 400 кг.

Жилой дом оборудуется всеми необходимыми инженерными системами и оборудованием согласно проектной документации: центральное водоснабжение и канализация, электроснабжение, оптоволоконный кабель связи, двухтрубная горизонтальная система отопления, вентиляция с естественным побуждением воздуха.

Квартиры запроектированы без выполнения чистовых отделочных работ.

Квартиры передаются со следующей отделкой: стены – штукатурка, полы – стяжка из цементно-песчаного раствора, потолки – затирка ж/б конструкций, подшивной потолок из ГКЛ в местах прохода инженерных коммуникаций, окна – ПВХ-профиль с двухкамерным стеклопакетом и оснащены детскими замками, элементы остекления лоджии – алюминиевый профиль с заполнением одинарным закаленным стеклом, электроснабжение – установка прибора учета электроэнергии, разводка электрики с установкой выключателей и розеток.

Встроенные помещения передаются со следующей отделкой: полы – стяжка из цементно-песчаного раствора, потолки – затирка ж/б конструкций, подшивной потолок из ГКЛ в местах прохода инженерных коммуникаций, покрытие стен и перегородок не выполняется, окна – ПВХ-профиль с двухкамерным стеклопакетом, электроснабжение – установка прибора учета электроэнергии, разводка электрики с установкой выключателей и розеток, система вентиляции для офисных помещений – приточно-вытяжная с механическим побуждением воздуха, для встроенных помещений торгового назначения – вытяжная вентиляция с механическим побуждением, отопление – скрытая разводка с установкой стальных панельных радиаторов и приборов учета теплоснабжения, водоснабжение – стояки горячего и холодного водоснабжения с приборами учета водоснабжения, канализация – стояк, подключение и установка унитаза, система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре.

Мусоропровод в жилом доме отсутствует.

В жилом доме отсутствуют жилые помещения, по которым при заключении договоров предпочтение должно отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, ИТП, электрощитовая, коридоры общего пользования, лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, кровля, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников, элементы озеленения и благоустройства дворовой и прилегающей к жилому дому территории.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения после приемки в эксплуатацию представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, предлагаются:

2 двухкомнатные квартиры, в том числе:

- № 103 на 10 этаже общей площадью 64,92 кв. м;

- № 149 на 22 этаже общей площадью 68,42 кв. м.

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади квартиры 4650 белорусских рублей.

Условия оплаты – 100 % от стоимости договора в течение 15 (пятнадцати) календарных дней с даты регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 20.10.2023 года по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

Для заключения договоров необходимы:

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44, (044) 559 33 91.**

ТРЫУМФ ЛІТАРАТУРНАЙ ДРУЖБЫ

Башкірскіх пісьменнікаў сустракаў Дом літаратара

Дэлегацыя башкірскіх і беларускіх пісьменнікаў у знак Дзён башкірскай літаратуры ў Беларусі ўсклала кветкі да Абеліска Перамогі ў Мінску.

— Вялікая Айчынная вайна сёння як ніколі ўспрымаецца як сімвал сяброўства, еднасці нашых народаў, народаў Расіі і Беларусі, народа Башкартастана і народа Беларусі, — сказаў у час цырымоніі на плошчы Перамогі старшыня Саюза пісьменнікаў Башкартастана празаік, публіцыст Айгіз Баймухаметаў. — Здаецца, увесь свет звар'яцеў, народы многіх краін бяздумна, не думаючы пра заўтрашні дзень, уступаюць у сваркі і бойкі, высвятляюць адносіны нават не ў фармаце інфармацыйных войнаў, а вядуць узброеную барацьбу. Як быццам не разумеюць знішчальную сілу ваеннай калатнечы?! Хіба думаюць арганізатары кровапраліцця пра заўтрашні дзень, пра нашчадкаў, пра захаванне самога жыцця на нашай планеце?!. А мы, нашы прашчуры, у Вялікую Айчынную вайну былі разам!.. Таму і слова, якое перадаём нашчадкам, павінна вучыць гэтай еднасці, павінна вучыць міру і стваральнасці. Мне вельмі прыемна, што беларусы прымаюць нас у Дзень Рэспублікі Башкартастан — у дзень нашага важнага свята.

Пасля ўскладання кветак у памяць башкартастанцаў, якія загінулі ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, госці наведалі Саюз пісьменнікаў Беларусі, дзе іх ужо чакалі многія паэты, празаікі, публіцысты, драматургі, дзіцячыя пісьменнікі нашай краіны, дзе была разгорнута выстаўка кніг і часопісаў з творамі башкірскіх пісьменнікаў. З вялікай цікавасцю ўсе гарталі часопісы на башкірскай мове, выслухоўвалі тлумачэнні, звязаныя з ацэнкай літаратурнага працэсу ў Башкартастане. Завязваліся жывыя, творчыя стасункі. А следам на сцэне актавай залы Дома літаратара адбылася ўрачыстая вечарына Дзён башкірскай літаратуры ў Беларусі. З прывітальнымі словамі да гасцей і ўдзельнікаў святочнай імпрэзы звярнуліся кіраўнікі пісьменніцкіх арганізацый Беларусі і Башкартастана — Алесь Карлюкевіч і Айгіз Баймухаметаў. А далей рэй павялі вядучыя — першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік, публіцыст, дзіцячая пісьменніца Алена Стэльмах і заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт і перакладчык Міхась Пазнякоў.

Сапраўдным падарункам для гасцей і гаспадароў стала песня «Мой Башкартастан», якую выканала народная артыстка Башкартастана Альфія Юлчурына. Дырэктар Нацыянальнага літаратурнага музея Рэспублікі Башкартастан Міляўша Кагарманава расказала прысутным пра повязь башкірскай і беларускай літаратур. Дарэчы, у 1936 годзе ў Мінску таксама працавала вялікая дэлегацыя пісьменнікаў з Уфы. Яны ўдзельнічалі ў трэцім пленуме Саюза савецкіх пісьменнікаў, дзе разглядалася і пытанне развіцця башкірскай савецкай паэзіі. З таго часу мінулі многія дзесяцігоддзі, але гэты факт літаратурнага пабрацімства памятаюць ва Уфе і цяпер... Сённяшнія госці з Башкартастана нагадалі, што сярод удзельнікаў пленума была і класік башкірскай літаратуры Хадзіш Даўлетшына (1905—1954). Яе першае апавяданне было надрукавана ў газеце «Моладзь Башкартастана» ў 1926 годзе. У 1931 годзе была надрукавана аповесць Хадзіш Даўлетшынай — «Айбіке» (дарэчы, па інфармацыі башкірскіх музейшчыкаў і бібліёграфаў, твор быў перакладзены на беларускую мову і выдадзены ў Мінску да пленума 1936 года). У 1932-м — аповесць «Хвалі калосся», у наступныя гады — новыя творы... У 1937 годзе таленавітая пісьменніца была рэпрэсіравана як жонка «ворага народа» (яе муж — наркам асветы Башкірскай АССР, пісьменнік Губай Даўлетшын). У 1942 годзе, пасля вызвалення, да самай смерці жыла ў Бірску, адміністрацыйным цэнтры Бірскага раёна Башкартастана. У 1942—1952 гадах працавала над раманам «Іргіз», які быў надрукаваны пасля яе смерці, у 1957 годзе. Пасмяротна Х. Даўлетшына ўганаравана першай Рэспубліканскай прэміяй імя Салавата Юлаева (у 1967 годзе) з фармулёўкай «За раман «Іргіз» (пасмяротна)».

Уласныя вершы на роднай мове на вечарыне чыталі башкірскія паэтэсы Зульфія Хананава, Ларыса Абдуліна, Гульназ Кутуева, Святлана Чураева, Міляўша Кагарманава. Творы Зульфіі Хананавай і Ларысы Абдулінай неаднойчы друкаваліся ў літаратурна-мастацкіх часопісах «Полымя», «Маладосць», газеце Літаратура і мастацтва» ў перакладзе на беларускую мову. Гарманічным дапаўненнем да выступлення паэтэс з Уфы стала чытанне вершаў башкірскіх паэтаў у перакладзе на беларускую мову. Гэта выдатна зрабілі Вольга Багушынская, Іна Фралова, Валянціна Драбышэўская.

У рамках праграмы вечарыны сваімі талентамі падзяліліся студэнты 4 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Уразіў усіх і ансамбль «Эльсэн», выступленне Гульсіны Абраскінай і Залії Азаравай з чытаннем верша народнага паэта Башкартастана Мустая Карыма «Не рускі я, але расіянін». А завяршылася сапраўднае свята літаратуры і дружбы выступленнем ансамбля народнай музыкі і песні «Мінскі гармонік» пад кіраўніцтвам Івана Катовіча.

...На завяршэнне Дзён башкірскай літаратуры дэлегацыя гасцей з Уфы наведалася ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Башкірскія літаратары падарылі ў фонды галоўнай кніжніцы Рэспублікі Беларусь вялікую калекцыю кніг паэтаў і празаікаў Башкартастана на башкірскай і рускай мовах. Гаспадары Нацыянальнай бібліятэкі адзначылі, што гэты падарунак стане асновай башкірскай кніжнай калекцыі.

З просьбай пракаментаваць завяршэнне Дзён башкірскай літаратуры ў Беларусі мы звярнуліся да **першага намесніка старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алены СТЭЛЬМАХ.** Вось што яна адзначыла: «Увесну, у сакавіку сёлетняга года Саюз пісьменнікаў Беларусі праводзіў разам з калегамі з Ташкента Дні ўзбекскай літаратуры ў Беларусі. Цяпер вось — Дні башкірскай літаратуры. Гэта становіцца добрай традыцыяй пашырэння ўяўлення чытачоў нашай краіны пра нацыянальныя літаратуры іншых народаў. Мы ўзнаўляем традыцыі ранейшых дзесяцігоддзяў, нагадваем пра стасункі, якія былі ў нашых класікаў. Жывыя сустрэчы літаратараў у сённяшнія дні — гэта і мост да большай актыўнасці літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў у справе знаёмства з башкірскай літаратурай у Беларусі, беларускай — у Башкартастане. Невыпадкова ж і склад дэлегацыі з Уфы гэтым разам быў у большай ступені з галоўных рэдактараў часопісаў. Мы абмеркавалі з калегамі мноства розных тэм, спланавалі шэраг сумесных кніжных праектаў, якія будуць рэалізаваны ў самы бліжэйшы час».

Па выніках Дзён башкірскай літаратуры ў Беларусі дасягнута дамоўленасць пра выданне анталогіі беларускай літаратуры ў Башкартастане і выданне анталогіі сучаснай башкірскай прозы і паэзіі ў перакладзе на беларускую мову. Мяркуецца, што асобныя кнігі башкірскіх паэтаў пабачаць свет у серыі «Сябрына: паэзія народаў Расіі». У прыватнасці, ужо падрыхтавана кніга з перакладамі вершаў і паэм Зульфіі Хананавай. Зборнік запланаваны да выдання на пачатку 2024 года. Беларускія калегі шмат распытвалі ў гасцей з Уфы пра развіццё дзіцячай літаратуры ў Башкартастане. А значыць, будуць новыя праекты і ў гэтым кірунку. Ёсць дамоўленасць і пра абменныя нумары ў часопісах Башкартастана і Беларусі. Пра гэта, у прыватнасці, на розных імпрэзах Дзён гаварыў галоўны рэдактар часопіса «Агідэль» Мунір Кунафін.

Застаецца чакаць іншых літаратурных свят — Дзён літаратуры Казахстана, Таджыкістана, народаў Расіі... Беларусь гатова сябраваць з усімі адкрыта, шчыра, з павагай да чужых традыцый, чужых мастацкіх і літаратурных скарбаў.

Мікола БЕРЛЕЖ.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: ЗАО «Группа производственных технологий и авиационного машиностроения «АЭРОМАШ» (УНП 101394957) 220026, г. Минск, а/я 81, в лице антикризисного управляющего ООО «Истмира», тел. +375 (29) 624-72-05.

Вторые повторные публичные торги в форме аукциона будут проведены: 30 октября 2023 г. 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, руб. с НДС
1	**Станок лазерный «Rabbit Flat Bed-2616» с инвентарным номером 00001034**	20 088,00
2	**Листогиб «AMADA RG103» с инвентарным номером 00000800**	51 264,00

Местонахождение: Минский район, г. п. Мачулищи, ул. Аэродромная, д. 3 (территория предприятия).

Тел. для ознакомления и осмотра +375 (29) 624-72-05.

Для участия в торгах необходимо в срок с 15.10.2023 г. 09.00 по 27.10.2023 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи не позднее 10 рабочих дней, оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Рэспубліка» от 21.07.2023 г.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский Агросервис»

Аукцион состоится **31.10.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:
1. Административное здание, инв. № 600/С-120828, 395,3 кв. м.
2. Склад, инв. № 600/С-120830, 472,6 кв. м.
3. Мастерская, инв. № 600/С-120832, 523,1 кв. м.
4. Комплексная трансформаторная подстанция ГКТП-1346 (160кВа), инв. № 20040984.
5. Комплексная трансформаторная подстанция ГКТП-1417 (400кВа), инв. № 20040985.

Адрес Лота № 1: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Гагарина, 21А/1; ул. Гагарина, 21а.
Обременения: аренда, ипотека.
Земельный участок 623650100001003002, 0,4868 га.
Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС 20 % – 888 862,45 руб.
Задаток – 100 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 27.10.2023 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Могилевский филиал
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды на имущество, принадлежащее Мстиславскому РАЙПО

Аукцион состоится **01.11.2023 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис организатора аукциона)

Лот № 1 –
ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ
с инв. № 723/С-6902 – Магазин «Книги»

Адрес: Могилевская обл., г. Мстиславль, ул. Калинина, д. 29, общ. пл. 83 кв. м. Срок заключения договора аренды – 1 год.
Здание имеет статус историко-культурной ценности.

Начальная цена – арендная плата в месяц за объект: 70 б.а.в (на 01.10.23 – 1 183,00 бел. руб. с НДС). Сумма задатка: 474,00 бел. руб.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: **по 31.10.2023 до 11.00.** В течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона Победитель перечисляет на расчетный счет Продавца цену продажи предмета аукциона за вычетом задатка. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня оплаты предмета аукциона подписать договор аренды помещений.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by

Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні загадчыцы аддзела рэалізацыі Святлане Ганцарэвіч з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.

«РАДУЕ, ШТО СЁННЯ Ў БІБЛІЯТЭКІ ВЯРНУЛІСЯ МАЛАДЫЯ СЕМ'І»

Гутарка з дырэктарам ЦСДПБ г. Мінска Аленай МАТВЕЕВАЙ

Заходзіш у гэтыя дзверы, і цябе сустракае Янка Купала. Ну, натуральна, не ўжывую, а ў выглядзе скульптуры — але яна ўвесь час знаходзіцца сярод захопленых мастацкім словам людзей і сярод кніг, таму здаецца адухоўленай. Тут, на першым паверсе будынка № 16 па вуліцы Веры Харужай, у самым ажыўленым цэнтры Мінска, знаходзіцца Купалаўка — Цэнтральная бібліятэка імя Янкі Купалы. Тут жа і цэнтр усёй мінскай бібліятэчнай сістэмы. Яшчэ тут віруе... Відаць, не спраўджваюцца прагнозы, што бібліятэкі, як і папяровыя кнігі ўвогуле, апынуцца на маргіналіях эпохі інфармацыйнага выбуху? Пра гэта і шмат іншага для чытачоў «Звязды» мы гутарым з дырэктарам Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска Аленай МАТВЕЕВАЙ.

Фота Лізаветы ГОПАД.

— Тое, што ваша жыццё звязанае з бібліятэкамі, — лёс ці выпадковасць?

— Я патомны бібліятэкар. Мая матуля, Яніна Феліксаўна, у дзяводцве Садоўская, скончыла філфак БДУ і нават вучылася з такімі выбітнымі асобамі, як Яўгенія Янішчыц і Анатоль Бутэвіч. Спачатку працавала настаўніцай у вясковай школе, а потым лёс прывёў яе ў Мінск, і яна пайшла працаваць у бібліятэку Беларускага політэхнічнага інстытута. У гады перабудовы калектыў галасаваннем абраў яе дырэктарам, так што я з самага маленства жыла ў бібліятэцы. Тады гэтыя ўстановы працавалі позна, да дзевяці-дзесяці вечара. Таму мне калі-нікалі даводзілася заставацца на круглыя суткі ў дзіцячым садку. Я ведала, што мама працуе побач, казала выхавацелям, што мне дрэнна, і мама прыбягала і забірала мяне на сваю работу. Для мяне бібліятэчныя закуткі і стэлажы былі і замкамі, і вежамі, — сапраўднай казкай, нягледзячы на тое што ў навуковай бібліятэцы ў асноўным былі навуковыя і вучэбныя выданні. Пасля школы я пайшла працаваць у бібліятэку і паралельна вучылася ва ўніверсітэце культуры на завочным аддзяленні. Быў перапынак, калі нарадзіла дачку... Але працавала ў бібліятэках заўсёды.

— І ніколі не было жадання паспрабаваць сябе ў іншых прафесіях?

— Не! Хоць прайшла дзве перападрыхтоўкі з вышэйшай адукацыяй. На базе БНТУ я атрымала кваліфікацыю інжынера-праграміста.

— Нечакана! Бібліятэкары звычайна ўспрымаюцца як гуманітарыі...

— Я хацела давесці, што здольная на гэта. Ад простага бібліятэкара я дарасла да загадчыка метадычнага аддзела бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Працавала ў навуковай бібліятэцы, сярод «тэхнароў», і хацела на адной мове размаўляць з імі. Сказаць, што навучанне далося цяжка, — не сказаць нічога. Усе хлопцы — ці пасля фізмата БДУ, ці з ваеннай акадэміі. Я была там адной дзяўчынай. За першую сваю сесію я схуднела на дзесяць кілаграмаў. У мяне яшчэ характар трохі перфекцыянісцкі, мая матуля смяялася, што калі ў пад'ездзе нейкая дзяўчына плача — гэта Лена са школы з чацвёркай ідзе. Атрымала дыплом...

— Бібліятэкар плюс праграміст — на сёння ўвасабленне ідэальнага бібліятэкара... Ужываеце свае тэхналагічныя веды ў асноўнай прафесіі?

— Зразумела. І калі мяне паклікалі сюды, у купалаўскую бібліятэку, былая дырэктар Алена Віктараўна Кубышкіна паставіла задачы, каб я ўнесла ў дзейнасць публічных бібліятэк нешта новае, інтэрактыўнае, віртуальнае. Мне было што падказаць аддзелу маркетынгу: на якіх платформах працаваць, як рабіць новыя цікавыя віртуальныя рэсурсы для нашай прафесійнай дзейнасці. А трэцяя перападрыхтоўка атрымалася, калі на дзяржаўным узроўні было прынята рашэнне стандартызаваць вышэйшую адукацыю, удасканаліць стандарт ISO-2011. Для гэтага пісаліся алгарытмы ўсёй дзейнасці ВНУ, і бібліятэчную справу ў тым ліку трэба было стандартызаваць. І перада мной паставілі задачу — напісаць стандарт «Бібліятэчная дзейнасць Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта». Тады я пайшла на трэцюю перападрыхтоўку і атрымала кваліфікацыю менеджара па якасці. І гэтая наша нарматыўная праца была зацверджана Дзяржстандартам.

— Але работа ў навуковай бібліятэцы і публічнай — гэта, мабыць, вялікая розніца?

— Так, вялікая! Калі ў 2013-м Алена Віктараўна Кубышкіна, якая ўзначальвала сістэму публічных бібліятэк Мінска, прапанавала мне ролю намесніка дырэктара сістэмы, я сумнявалася. Бібліятэкі ВНУ і публічныя — два светы з рознымі задачамі, хоць і ў тых жа бібліятэках ВНУ ёсць аддзел сацыягуманітарнай дзейнасці. Але многае было мне ў навіну. У першы дзень, скажу шчыра, нават баялася з кабінета выйсці. Але было і вельмі цікава. Калі ў навуковай бібліятэцы я займалася навуковай працай і няшмат кантактавала з чытачом, то тут наадварот. Пачаліся масавыя мерапрыемствы, дзякуючы якім я пазнаёмілася з літаратурным светам. Мы супрацоўнічаем з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, а з Міхасём Пазняковым, старшынёй Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, на базе бібліятэкі стварылі Тэатр паэзіі і ўжо сёмы год запар робім імпрэзы.

— Бераце ўдзел у спектаклях Тэатра паэзіі?

— Міхась Пазнякоў лічыцца яго дырэктарам, а я — намеснікам, так што, можна сказаць, маю і тэатральную пасаду, хоць і неафіцыйную... Да таго ж мы зрабілі праект «Тэатр і кніга: адкрываем новыя магчымасці» з мінскімі тэатрамі — пачалі супрацоўніцтва з ЦЮГам, потым далучыліся Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі. Перад спектаклямі бібліятэкары ўводзяць гледачоў у тэму, распавядаюць пра эпоху, аўтара п'есы, робяць інтэрактыўныя віктарыны. Часта гэта бывае, калі запрашаюць у тэатры навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў. Напачатку праект і задумваўся трохбаковым: бібліятэкі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, тэатры і публічныя бібліятэкі.

— І вы гаворыце прадмовы?

— Я асабіста не, а вось некаторыя нашы дзяўчаты нават зоркамі тэатральнымі могуць лічыцца, таму што яны нават на сцэне тэатра выступалі, і ў іх атрымлівалася. Але заўсёды прымаю ўдзел у праекце «Бібліятэкі пад адкрытым небам». Гэты праект уключылі ў праграму мінскага турыстычнага сезона. У нас ёсць свая пляцоўка каля ратушы, дзе намі і сістэмай дзіцячых бібліятэк кожную суботу прадстаўляюцца праграмы на розныя тэмы для мінчан і гасцей сталіцы. Гэта ж адбываецца і на раённых пляцоўках. Рыхтуем віктарыны, квэсты, перасоўныя выставы.... Прымаюць удзел пісьменнікі. Яшчэ вельмі люблю праект «Бібліяноч». Ён атрымліваецца маштабны, разнастайны, бо наша сістэма ўключае дваццаць пяць публічных бібліятэк, дзве з іх спецыяльныя — гарадская бібліятэка для сляпых і адзіная ў краіне нотна-музычная бібліятэка. Тэмай «Бібліяночы» ў гэтым годзе была «Традыцыі. Тое, што нас аб'ядноўвае». Спалучэнне і літаратурнага слова, і тэатральнага дзеяння, і беларускай кухні; і танчылі, і кіно глядзелі... Яшчэ з працы ў навуковай бібліятэцы я ўзяла традыцыю навуковых канферэнцый. Мы ўжо некалькі гадоў ладзім міжнародныя канферэнцыі «Бібліятэка. Болей, чым заўсёды». Стараемся ў нашу бібліятэчную, прафесійную размову ўключыць пісьменнікаў, выдаўцоў, нашых калег з літаратурных музеяў, і з Беларусі, і з Расіі. Вельмі матывуе, калі абменьваешся досведам. У гэтым годзе ў нашай канферэнцыі брала ўдзел намеснік дырэктара Санкт-Пецярбургскай «Маякоўкі» — бібліятэкі імя Маякоўскага, і тое, што робіцца сёння ў іх бібліятэцы — космас. Чытач можа сам здаць кніжкі пры дапамозе спецыяльнага аўтамата. У бібліятэцы яго сустрэне робат, які падкажа, куды ісці. У Санкт-Пецярбургу вельмі сур'ёзная бібліятэчная школа. Кожны год яны абіраюць бібліятэчную сталіцу Ленінградскай вобласці — маленькі гарадок, туды ўсе з'язджаюцца, праходзяць прафесійныя мерапрыемствы. Дзякуючы гэтаму праекту я трапіла ў такія гарады, як Сасновы Бор на беразе Фінскага заліва, у Тосна... Я размаўляла з дэканам бібліятэчнага факультэта з Санкт-Пецярбурга, які сказаў, што ў іх конкурс — 8-10 чалавек на месца.

— Дык прафесія бібліятэкара робіцца прэстыжнай?

— Так, стаўленне да нашай прафесіі пераглядаецца. Ёсць моладзь, хоць яе не хапае. Выпускнікі нашага ўніверсітэта культуры проста на вагу золата. Заўсёды чакаем маладых спецыялістаў. Будзем працаваць у напрамку адукацыі па накіраванні. Прыглядаемся да юных чытачоў, якія шмат чытаюць, з павагай ставяцца да бібліятэк, каб накіраваць іх для навучання, а потым прыняць на працу... Калі малады спецыяліст прыходзіць да нас працаваць, вельмі мала хто мяняе прафесію.

— А ці прыходзяць хлопцы?

— Ёсць і хлопцы. Хоць пакуль няшмат.

— А як сучасныя тэхналогіі ўжываюцца для папулярызацыі беларускай літаратуры? Цяпер жа ў сеціве можна сустрэць і работу з нейрасеткамі — робяць ілюстрацыі да любімых кніг, змяшчаюць кніжныя відэаблогі, буктрэйлеры, ролікі ў TikTok, Instagram, тэлеграм-канале, мемы, апытанкі... Ці карыстаецеся нечым падобным?

— Вядома, карыстаемся. І заўважу, што, калі вы прыйдзеце ў любую нашу публічную бібліятэку, на першым месцы там будзе беларуская літаратура. Я вельмі рада, што нам выпучылі сродкі, і мы рэнавіравалі свой сайт publib.by. Можна сказаць, новы сайт зрабілі, у якім значна пашырыліся магчымасці для размяшчэння нашых віртуальных рэсурсаў. Там ёсць электронны каталог, па якім можна выбраць кнігу, седзячы дома, даведацца, якія мерапрыемствы плануюцца. Ёсць базы даных — і па беларускай літаратуры, і па краязнаўстве. Акрамя сайта, вядзём усе віды сацыяльных сетак: Instagram, і «Фэйсбук», і «УКантакце», і тэлеграм-канал свой ёсць, і YouTube-канал Kupalovka Life. Самі бібліятэкары распрацоўваюць інтэрактыўныя цікавосткі, каб не проста быў расповед пра пісьменніка ці нейкі твор, а ў незвычайнай форме — крыжаванка, квэст, віктарына... Ладзім конкурсы. Аб'явілі конкурс у рамках сумеснага праекта з Выдавецкім домам «Звязда» «Чытач запрашае «Звязду». У гэтым годзе мы выбіраем найлепшага пісьменніка, які выдаецца ў Выдавецкім доме «Звязда».

— Самі шмат чытаеце?

— Так, і ў падборы літаратуры спадзяюся на сваіх бібліятэкараў — яны заўсёды робяць агляды новых выданняў, якія паступаюць да нас. А ўвогуле люблю чытаць класіку, асабліва Чынгіза Айтматава, у маладым узросце ў мяне была любімая кніга Барыса Васільева «А золкі тут ціхія». Скандынаўскія дэтэктывы чытаю... Люблю слухаць аўдыякнігі — яшчэ і таму, што з-за праблем са зрокам мне цяжка чытаць дробныя шрыфты. Шкада, пакуль няма грунтоўнай электроннай бібліятэкі сучаснай беларускай літаратуры, аўдыякніг, прычым прафесійна агучаных.

— Я пабачыла ў вас цікавы інтэрактыўны стэнд, прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны...

— Так, мы зрабілі выставу на вельмі сур'ёзную тэму — генацыд беларускага народа. Прэзентавалі для маладых чытачоў першы такі ў краіне стэнд з дапоўненай рэальнасцю. Калі навесці тэлефон на QR-код, ажывае хроніка ваенных часоў, і гэта дазваляе больш глыбока акунуцца ў трагічныя старонкі беларускай гісторыі. Ёсць яшчэ задума цікавага праекта. Мы робім базу даных «Іх імёнамі названы вуліцы Мінска». І вырашылі зрабіць асобным праектам «Вуліцы Перамогі» — для вуліц, якія носяць імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны, зрабіць інтэрактыўныя шыльды на дамах. Калі падносіш тэлефон да QR-коду на гэтай шыльдзе ці наводзіш на фотаздымак героя, пачынаецца дапоўненая рэальнасць: герой ажывае і распавядае пра сябе. Любы, каго гэта зацікавіць, можа перайсці па спасылках і прачытаць больш пра гэтага гістарычнага персанажа. Адзін з нашых партнёраў — гэта Беларускі архіў кінафотафонадакументаў, для праекта ён дасць спасылкі на дакументы, якіх няма ў агульным доступе. Размяшчаем у рамках праекта бібліяграфічную інфармацыю, спасылкі на віктарыны, на творы, прысвечаныя таму ці іншаму герою. Спадзяёмся, што гэты праект выкліча цікавасць, і асабліва ў маладога пакалення. Мы імкнёмся, каб гэтыя віртуальныя праекты дапамагалі нам у нашай асноўнай працы — у бібліятэчным абслугоўванні, асветніцкай сферы, патрыятычным выхаванні. Каб гэтыя рэсурсы не адбіралі ў нас нашых чытачоў, а наадварот, дапамагалі іх аб'яднаць вакол бібліятэкі.

— Да якіх праектаў яшчэ можна далучыцца праз ваш сайт?

— Праект «Фактар чытання» — выбар самых папулярных беларускіх кніг чытачамі і бібліятэкарамі. Акцыя «Мы — адзіныя» — фотаконкурс да Дня народнага адзінства. Праектаў шмат, а калі чытач не змог прысутнічаць на якім-небудзь мерапрыемстве, можа пабачыць відэасправаздачу. Мы стараемся зруйнаваць устаноўку «Цішыня павінна быць у бібліятэцы». Радуе, што сёння ў бібліятэкі вярнуліся маладыя сем'і. Прыходзяць усе разам — мама, тата, дзеці. Гэту тэндэнцыю я назіраю дзесьці трэці год... Пакаленне, якое вярнулася ў бібліятэкі.

Гутарыла
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ЕЛІЗАР'ЕЎ: УЛЮБЁНЕЦ ЛЁСУ

Што ні год, то ёсць нагода гаварыць пра народнага артыста Беларусі і СССР харэографа Валянціна ЕЛІЗАР'ЕВА. Летась у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры Беларусі адзначалі яго 75-годдзе. А сёлета роўна 50 гадоў з таго моманту, як ён служыць тэатру Беларусі. Вялікаму тэатру. Краіны, якая стала для яго домам. Для якой ён фактычна стварыў брэнд пад назвай «Беларускі балет» і цяпер працуе на яго як мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Беларусі.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч ад імя ўрада краіны павіншаваў юбіляра:

— Вашы дзёрзкія думкі нараджаюць унікальныя пастаноўкі: «Стварэнне свету», «Спартак», «Ціль Уленшпігель», «Рамэа і Джульета», «Лебядзінае возера», «Шчаўкунок», «Спячая прыгажуня». Менавіта гэтыя балеты — адкрыцці дазволілі Валянціну Елізар'еву разам з Вялікім тэатрам Беларусі заваяваць сусветную славу. Гэтыя балеты і сёння з'яўляюцца ўпрыгожваннем Вялікага тэатра. Яны не падуладныя часу. Як і не падуладнае часу сапраўднае мастацтва. Час толькі дадае ім бляску. Вы прызнаны і самы тытулаваны балетмайстар не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Чалавек, у якога шмат розных узнагарод, ганаровых званняў рознай вартасці. Але самая галоўная ўзнагарода — гэта любоў гледача, тых людзей, хто вас заўсёды вітае стоячы, апладысментамі. І так будзе заўсёды.

— 50 гадоў прысвечана мастацтву Беларусі, музычнаму тэатру — опернаму, балетнаму, — гаворыць Валянцін Елізар'еў. — Я не выбіраў сабе прафесію ў жыцці. З ранніх гадоў ведаў, што падабаецца. Бацькі мне ва ўсім дапамагалі. Усё ішло натуральна: займаўся ў дзіцячай самадзейнасці, пасля паступіў у Бакінскае харэаграфічнае вучылішча. Потым перавёўся ў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (цяпер гэта акадэмія імя Агрыпіны Ваганавай). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю і па размеркаванні апынуўся на гэтай бласлаўёнай зямлі. Я пабачыў трупу на гастролях у Кіеве, тады яна была ўжо стомленая, гастролі заканчваліся. Потым прыехаў у Мінск, мне паказалі тэатр. Выйшаў на сцэну... І калі ўбачыў гэтую грандыёзную распранутую сцэну, магутную, прыгожую, то сказаў сабе: «Я тут абавязкова павінен паставіць спектакль ці два...» Так і адбылося. А потым палюбіў трупу, палюбіў людзей, з якімі працаваў. Ставіў спектаклі... Напэўна, я ўлюбёнец лёсу. Таму што ўсё жыццё займаюся сваёй любімай справай. Так рэдка ў людзей бывае.

Шмат якія легендарныя балеты, пастаўленыя майстрам у розныя гады, даўно сышлі са сцэны, але памяць пра іх захоўваецца, нават перадаецца праз пакаленні расповед пра тое, як гэта было прыгожа і нечакана. Па-новаму і магутна. Можа, гэта адчувае і сам харэограф, таму што пасля вяртання ў тэатр, ён пачаў аднаўляць свае найлепшыя балеты. Не хавае, што ёсць думкі аднавіць балет «Ціль Уленшпігель» кампазітара Яўгена Глебава і гісторыю пра Рагнеду (балет «Страсці» Андрэя Мдзівані): жанчыны плакалі пасля гэтага спектакля...

— Многія дзесяцігоддзі мае спектаклі жывуць у тэатры. Карыстаюцца поспехам, — адзначае мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Беларусі. — Ведаеце: ёсць фінансавы поспех у тэатра — спектакль трымаюць, а калі няма, то здымаюць. Яны прыносяць тэатру прыстойныя даходы. І публіка любіць мае спектаклі. Таму скардзіцца няма на што.

